

Чаму краіны адмаўляюцца ехаць на «Еўрабачанне»?

СТАР. 3



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Сын камерунца і беларускі з прозвішчам Янкі Купалы

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. ПЯТНІЦА № 187 (27552) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПАТЭНЦЫЯЛ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з афіцыйным візітам у Казахстан, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Адразу з аэрапорта Прэзідэнт накіраваўся да манумента «Абаронцам Айчыны», да якога ўсклаў кветкі. Манумент размешчаны ў адной з зялёных зон старой часткі Астаны, якая служыць месцам правядзення парадаў з нагоды святкавання Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і паркам адпачынку для жыхароў горада.

Побач з манументам знаходзіцца Алея кіраўнікоў дзяржаў з растучымі елкамі, якія пасадзілі прэзідэнты замежных дзяржаў, што наведвалі ў розны час Астану. Адно з дрэў у час візіту ў Казахстан у маі 2005 года пасадзіў Аляксандр Лукашэнка.

Праграмай візіту запланаваны перагаворы Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева ў фармаце «сам-насам» і пашыраным складзе, сумеснае наведванне Беларуска-казахстанскага вучэбна-вытворчага цэнтра падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі інжынерных кадраў пры Казахскім агратэхнічным універсітэце імя С. Сейфуліна.

Па выніках перагавораў чакаецца падпісанне шэрагу двухбаковых дакументаў.

Па аб'ёме беларускага экспарту Казахстан з'яўляецца трэцім па значнасці партнёрам Беларусі сярод краін СНД (пасля Расіі і Украіны). Беларусь разглядае Казахстан у якасці апорнай пляцоўкі для нарошчвання экспарту ў рэгіён Цэнтральнай Азіі.



Аляксандр Лукашэнка ўсклаў кветкі да падножжа манумента «Абаронцам Айчыны» ў Астане.

Фота БЕЛТА.

## ЛАНДШАФТНЫ ДЫЗАЙН МАЛАДОГА ЛЕСНІКА

**Малады ляснік Магілёўскага лесагаспадарчага аб'яднання Павел ТОРЧЫК захапляецца стварэннем невялікіх архітэктурных формаў, якія прыемна аздабляюць тэрыторыю лясніцтва і ландшафт каля вёскі Хомічы.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр ГРУШНІК, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

***«Міграцыйныя патокі паміж Рэспублікай Беларусь, Расійскай Федэрацыяй, іншымі краінамі — гэта сёлетнія рэаліі. Адток кадраў з Беларусі ў асноўным носіць характар часовай падпрацоўкі з мэтай матэрыяльнай падтрымкі сваіх сем'яў, якія працягваюць жыць, вучыцца, працаваць у рэспубліцы. Працоўная міграцыя садзейнічае вырашэнню праблемы залішняй занятасці ў арганізацыях. Міграцыя высокакваліфікаваных спецыялістаў — залог узаемавыгаднага развіцця краін — удзельніц тых ці іншых міжнародных саюзаў. Паколькі гаворка ідзе аб узбагачэнні ідэямі, ведамі, прафесійнымі навыкамі, якія і вызначаюць эфектыўнасць сучаснага эканамічнага развіцця, міграцыя гэтых спецыялістаў уяўляе агульны інтарэс. Але толькі ў тым выпадку, калі гаворка ідзе аб часовай, зваротнай міграцыі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.10.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9100,00 | ▼ |
| Еўра | 12370,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 283,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1111,11 | ▼ |

■ Надвор'е

### ХОЛАД «АДПУСЦІЦЬ»

**А на наступным тыдні прыгрэе да 16 цяпла**

**У пятніцу тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў антыцыклону з цэнтрам над паўднёвым усходам Польшчы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Гэты антыцыклон будзе гаспадарыць у нас і на выхадныя. Прагназуецца без істотных ападкаў, а ўначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы на суботу і нядзелю плюс 1-6 градусаў, месцамі замаразкі да 0 — мінус 4 градусаў. Удзень тэмпературны фон стане павялічвацца, у суботу чакаецца ўжо плюс 7-12, а ў нядзелю — 8-14 цяпла. На пачатку наступнага тыдня будзе пераважна без ападкаў, толькі на поўначы прагназуюцца невялікія кароткачасовыя дажджы. Раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак 1-6 цяпла, а на тарфяніках Палесся замаразкі да 0-мінус 3 градусаў. Удзень у панядзелак плюс 10-15 градусаў.

Паводле папярэдніх разлікаў айчынных сіноптыкаў, да сярэдзіны наступнага тыдня ў паўночных раёнах прагназуюцца невялікія дажджы. У аўторак і сераду тэмпература паветра ўдзень будзе дасягаць ужо 11-16 цяпла. Згадзіцеся, што гэта даволі камфортнае надвор'е для кастрычніка, а сіноптыкі чакаюць яшчэ і «бабіна лета».

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Агра+эка=турызм

## БІЗНЕС ДЛЯ ДУШЫ

**Як надакучыў ужо гэты шум! Безліч машын, якія праязджаюць туды-сюды, не бачачы нікога. А ты ідзеш па вуліцы, дзе дамы такія шэрыя, масіўныя і пагрозлівыя, што хочацца схавацца. Гады ў рады з'явіцца перад вокам жывы твар, што ідзе насустрач і ўсміхаецца. А часцей — кожны бачыць толькі (няхай нават каляровую!) плітку пад нагамі і шоргае па ёй, як па згубленых у камені хвілінах. Кватэра (ці як казалі ў адным фільме «скрыня з дзіркамі») сустракае хоць і цяплом пасля вячэрняга марознага ветрыку, аднак усё роўна не радуе. Ты засынаеш не ад прыемнай стомленасці цела пасля бадзёра пражытага працоўнага дня, а ад таго, што табе не хапае паветра. Такая сонная страта прытомнасці. А прачынаешся...**



Так у сваёй сядзібе Васіль Фралоў паказаў, як мядзведзі лазілі на борцевыя дрэвы і як ад гэтага абараняліся людзі.

А прачынаешся ў свежым ложку, уцягваеш ноздрамі халаднаватае, ажно казытлівае, паветра і, пазяхнуўшы ды пацягнуўшыся, глядзіш у акно. А там — вёска.

Думаеце, я навыдумляў тут немаведама чаго? Ды не. Гэта абсалютна верагодная сітуацыя. З развіццём аграсядзіб многія перажылі падобны сцэнарый. А камусьці нават так спадабалася, што яны вырашылі назаўжды пераехаць у вёску і таксама прымаць гасцей, таксама заняліся аграэкатурызмам. І, дарэчы, паспяхова. Хачу падзяліцца з вамі вопытам некаторых такіх людзей сваімі назіраннямі і высновамі.



### А ВЫ ВЕДАЛІ, ШТО НОВАЯ ПЧАЛІНАЯ МАТКА ЗАБІВАЕ СВАІХ САПЕРНІЦ?

Я дык даведаўся аб гэтым у аграсядзібе «Свет пчол», якая знаходзіцца ў вёсцы Барок Валожынскага раёна. «Месца гэта так называецца, відаць, таму, што тут быў бор з вялікай колькасцю борцевых дрэў, гэта значыць, такіх, у якіх жылі пчолы», — распавядае Васіль Фралоў, гаспадар сядзібы.

Каб прыцягнуць увагу да сваёй аграсядзібы, сям'я доўга думала і раілася з калегамі праз грамадскі савет па развіцці сельскага турызму свайго раёна. Пасля вырашылі стварыць музей пчол. І справа пайшла ўгару. І дзеткі, і дарослыя з задавальненнем прыязджаюць сюды, ядуць блінцы з мёдам і даведваюцца шмат цікавых фактаў з жыцця самых працавітых насякомых.

СТАР. 2

■ Кантрольная праверка

## У ЧЫМ ПРЫЧЫНА ДАЎГАБУДУ?

**На Віцебшчыне пабывалі члены групы, створанай па даручэнні кіраўніка дзяржавы для вывучэння праблемных пытанняў будаўнічай галіны і выпрацоўкі канкрэтных мер па іх вырашэнні. Яны наведалі даўгабуды ў Талачыне, Оршы, Віцебску і Наваполацку.**

### ЗАРОБАК БУДАЎНІКОЎ — ДА 12 МІЛЬЁНАЎ

У Талачыне ў жылым доме, які планавалі здаць «пад ключ» у верасні, павінны справіць наваселле 48 сямей. Сярод усіх кватэр тры — так званыя сацыяльныя, а гаспадарамі астатніх стануць тыя, хто «крэдытуецца на льготных умовах». Чаму дом не пабудаваны поўнасцю і своечасова? — гэтае канкрэтнае пытанне задалі «рэвізоры» прадстаўнікам райвыканкама, заказчыкам будаўніцтва і генеральным падрадчыкам. Высветлілася, што дом пачалі будаваць яшчэ ў маі 2011. Спачатку тут працавала мясцовая дзяржаўная будаўнічая арганізацыя (*ПМК. —* **Аўт.**), якая спыніла існаванне. Аб'ект быў перададзены для завяршэння таксама мясцоваму, але ўжо недзяржаўнаму — вытворчаму ўнітарнаму прыватнаму прадпрыемству.

— Былі і застаюцца праблемы з фінансаваннем. Больш за 1 мільярд рублёў складае доўг за нашу працу. Аплата ідзе з вялікім адставаннем. Калі б нам пералічылі ўсё, што патрабуецца, безумоўна, здалі б дом своечасова, нават раней, чым запланавана, — расказвае Васіль Федаровіч, галоўны інжынер прадпрыемства «Друць».

Паводле яго слоў, рабочых і тэхнікі хапае. Акрамя жылля, арганізацыя будуе аб'екты сельскагаспадарчага прызначэння. Дэфіцыту кадраў няма. І гэта зразумела, калі заробак кваліфікаваных рабочых — ад 5 да 12 мільёнаў рублёў (*столькі заплацілі тым, хто займаўся насцілам даху. —* **Аўт.**).

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗША АПЯРЭДЖВАЮЦЬ РАСІЮ ПА НАФТАЗДАБЫЧЫ



Паводле звестак Міжнароднага энергетычнага агенцтва (IEA) і Кіраўніцтва энергетычнай бяспекі ЗША (EIA) у ліпені 2013 года ЗША сумарна здабывалі да 22 мільёнаў барэляў вуглевадародаў за суткі. Для параўнання, у Расіі ў 2013 годзе здабыча нафты і газу павінна была скласці 21,8 мільёна барэляў за суткі. Найбуйнейшым вытворцам нафты ў 2013 годзе застаецца Саудаўская Аравія, дзе ў першым паўгоддзі здабывалася да 11,7 мільёна барэляў у суткі. Прычынамі росту нафтаздабычы ў ЗША стала распрацоўка сланцавых радовішчаў, найбуйнейшыя з якіх — Бакен і Ігл Форд — размешчаны ў Паўночнай Дакоце і Тэхасе. Павышэнне здабычы вуглевадародаў са сланцаў у ЗША здольна панізіць цэны на сыравіну па ўсім свеце, таму што Злучаныя Штаты доўгі час былі аднымі з вядучых нафтавых імпарцёраў.

### ЛІТВА МОЖА БЛАКІРАВАЦЬ КАЛІНІНГРАД

Літва можа заблакіраваць чыгуначныя і аўтамабільныя зносіны Расіі з Калінінградскай вобласцю, заявіў міністр замежных спраў Літвы Лінас Лінкявічус. Ён адзначыў, што яго краіна пойдзе на такі крок, калі Масква «не спыніць ціск на сваіх суседзяў». Раней МЗС Літвы паведаміў, што з 30 жніўня на літоўска-расійскай мяжы падвяргаюцца дбайнай праверцы зарэгістраваныя ў Літве легкавыя аўтамабілі, а з 11 верасня — і грузавыя, якія адпраўляе Літва. З-за гэтага літоўскія перавозчыкі панеслі страты не менш як дзесяць мільёнаў еўра. Заява прагучала напярэдадні саміту Усходняга партнёрства ў Вільні. Літва з'яўляецца адным з асноўных прыхільнікаў больш хуткага падпісання Еўрасаюзам і Украінай пагаднення аб асацыяцыі і стварэнні зоны свабоднага гандлю. Пагадненне фактычна пазбаўляе Украіну магчымасці ў будучыні далучыцца да Мытнага саюза з-за неадпаведнасці паміж заканадаўчымі нормамі.

### АМЕРЫКАНЦАЎ ПРЫЗНАЛІ АДНЫМІ З САМЫХ «ТОЎСТЫХ І ХВОРЫХ»



На сусветным эканамічным форуме навукоўцы прызналі амерыканцаў аднымі з самых «тоўстых, нервовых і хворых жыхароў Зямлі», піша The Washington Post. У новай канцэпцыі «Індэкса чалавечага капіталу» ўлічваецца колькасць неінфекцыйных захворванняў — атлусцення, цукровага дыябету, хвароб сэрца. А таксама ўзровень адукацыі, медыцынскія магчымасці і шэраг іншых крытэрыяў. Навукоўцы адзначаюць у ЗША высокі ўзровень уплыву хвароб на развіццё бізнесу і агульны эканамічны стан краіны. ЗША знаходзяцца на 112-м месцы ў рэйтынгу з 122 дзяржаў па індэксе капіталу. Лідзіруюць у рэйтынгу невялікія еўрапейскія краіны, у той час як вялікія і развітыя краіны пакутуюць ад большай колькасці негатыўных фактараў.

ISSN 1990 - 763X

13187

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ



### У 2013 ГОДЗЕ МІГРАНТЫ ПЕРАВЯДУЦЬ ДАДОМУ 414 МІЛЬЯРДАЎ

**Краіны, якія пастаўляюць рабочыя рукі на сусветны рынак працы, збяруць добры ўраджай грашовых пераводаў — 550 млрд долараў. Гэта на 6,3 % вышэй за леташні паказчык, сведчыць новы даклад падраздзялення міграцыі і грашовых пераводаў Сусветнага банка. Пераводы мігрантаў ужо цяпер перавышаюць ВУП такіх краін, як Аўстрыя або ПАР. А да 2016 года іх аб'ём, паводле ацэнак Сусветнага банка, вырасце да 540 млрд.**

Па ўсім свеце (з улікам паступленняў як у развітыя краіны, так і ў тыя, якія развіваюцца) пераводы 232 млн працоўных мігрантаў складзе 550 млрд сёлета і звыш 700 млрд долараў да 2016 года. Лідарамі па намінальным аб'ёме паступленняў пераводаў з-за мяжы ў гэтым годзе застаюцца Індыя (чакаецца каля 71 млрд долараў), Кітай (60 млрд), Філіпіны (26 млрд), Мексіка (22 млрд) і Нігерыя (21 млрд). Гэтая пяцёрка амаль не змяняецца ўжо некалькі гадоў. У лік буйных атрымальнікаў пераводаў у свеце, які развіваецца, у 2013 годзе таксама ўвойдуць Украіна, Егіпет, Пакістан, Бангладэш, В'етнам.

Па звестках СБ, Таджыкістан трэці год застанецца лідарам сусветнага рэйтынгу ў адносінах чыстага аб'ёму атрыманых пераводаў мігрантаў да ВУП. У 2012 годзе гэты паказчык складаў 48 % ВУП. Асноўнай крыніцай пераводаў для Таджыкістана з'яўляецца Расія.

## ЦІ ТРЭБА ДАВАЦЬ ДЗЕЦЯМ КІШЭННЫЯ ГРОШЫ?



**Вольга ЧАМАДАНАВА, начальнік інспекцыі па справах непаўналетніх Мінскага РУУС:**

— Адкажу пытаннем на пытанне: а ці трэба даваць дзецям кішэнныя грошы? Адзеннем і ежай іх забяспечваюць бацькі. У школе таксама кормяць — проста трэба здаць неабходную суму настаўніцы. Калі ж дзіцяці не падабаецца школьная ежа, яму можна пакласці што-небудзь з сабой — тое, што ён любіць. Такім чынам, кішэнныя грошы — гэта, хутчэй, перастрахоўка. І перад тым, як іх даць, бацькі павінны ведаць, навошта яны патрэбны дзіцяці. Часта тыя не трацяць кішэнныя грошы на тое, пра што дамаўляліся з бацькамі, а збіраюць. На нешта, што бацькі ім не купяць, што не ўваходзіць у планы сямейнага бюджэту. А яшчэ для многіх падлеткаў звыклай справай бывае набыць на кішэнныя грошы забароненае — алкагольныя напоі ці цыгарэты.



**Вольга НІКІЦІНА, прадпрымальнік, бізнес-кансультант, г. Мінск:**

— Безумоўна, дзецям неабходна даваць кішэнныя грошы, інакш як яны навучацца імі распараджацца? Напачатку трэба даваць невялікую, у залежнасці ад узросту, суму: пяць тысяч — на адзін дзень, дваццаць тысяч — на 4-5 дзён. Пры гэтым неабходна абмяркоўваць, на што і як дзіця збіраецца іх патраціць. З часам можна даваць і больш. Таксама я раю вучыць дзяцей грашовай граматнасці з 9-11 гадоў, бо ў школах такіх заняткаў пакуль што не ўвялі, звычка робіць сваё і даросламу чалавеку памяняць звыклыя адносіны да грошай становіцца амаль немагчыма. Вельмі важна не толькі навучыць дзіця правільна распараджацца грашыма, але і з павагай ставіцца да зробленых бацькамі грошай.



**Сяргей ПРЫЛУЦКІ, паэт, г. Кіеў:**

— Дзецям трэба даваць і грошы, і ўсё астатняе. Але галоўнае — каб ім давалі магчымасць заставацца дзецьмі, а не «загружалі» з самых народзінаў нечым кшталту не лазь па дрэвах, не хадзі па лужах. Мне давалі грошы — няшмат, але давалі. Ды мы, здаралася, калі не хапала, клянчылі дробязь у людзей на вуліцы — такі своеасаблівы майстар-клас па акцёрскім майстэрстве. А наконт дарагіх падарункаў — гэта больш праблема не дзяцей, а дарослых. Дзецям часам дастаткова мячыка і пагуляць дапазна. А вось за «стопяцьсот» тысяч падарунак ці за 5 рублёў — справа дзясятая. Іншая рэч, калі дзіця адмыслова патрабуе штосьці дарагое. Тады, лічу, трэба падарыць яму найтаннейшую драўляную свістульку і пакласці спаць а 8-й вечара!

**Падрыхтавала Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# БІЗНЕС ДЛЯ ДУШЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Акрамя гэтага, гаспадары ладзяць шматлікія імпрэзы і народныя святкаванні — на Масленіцу, Купалле і гэтак далей. «Масленіца сёлета працягвалася ледзь не да красавіка, — смяецца Васіль Фралоў. — Бо мы для кожнай групы робім асобную імпрэзу, каб усе змаглі паўдзельнічаць у гульнях і танцах». Тым больш, што тут часта бываюць замежнікі, для якіх нашы традыцыі — нешта недасягальнае. «Здарыўся аднойчы цікавы выпадак, звязаны з менталітэтам. Была ў нас група афганскіх жанчын. Пачаў распавядаць пра тое, што труцень гіне падчас спарвання. Вы б бачылі іх твары: я думаў, што яны самі загінулі... Сядзяць і не варушацца. Для іх было шокам тое, што мужчына гіне», — кажа гаспадар сядзібы.

### Як знайсці наведвальнікаў?

«Мы шмат працуем з турыстычнымі фірмамі. Акрамя таго, пачаўся «вяртальны турызм», калі тыя, хто быў тут, прыязджаюць ізноў самі ды яшчэ сяброў з сабою бяруць. Гэта нават больш цяпер працуе», — дзеліцца вопытам Васіль Фралоў. Таксама ён расказаў, што хутка ў іх з'явяцца спальныя месцы для турыстаў: «Узялі крэдыт і будзем надбудоўваць мансардны паверх. Чалавек дванаццаць мы пасля зможам прыняць».

### Як пачынаўся «бізнес»?

«Мы гэтае месца доўга шукалі. Гады два ездзілі вакол Мінска, пакуль не знайшлі патрэбнае. Купілі зямлю і пачалі працаваць. Але на ўладкаванне пайшло два гады, — прызнаецца гаспадар. — Цяпер ужо ёсць акупляльнасць. Да 6-7 тысяч турыстаў за год прыязджае». Але бізнесам сваю справу Васіль Фралоў назваць не можа: «Гэта для душы ўсё робіцца. І значна пашыраць тут усё не вельмі хочацца. Гэта ўжо будзе прадпрыемства, знікне ўтульнасць і зачараванне. Я лічу, што будучыня менавіта за невялікімі гаспадаркамі, а не за вялікімі комплексамі тыпу «Дудутак».

### Крэдыт — гэта страшна?

«Узяць крэдыт не цяжка. І мясцовыя ўлады ў гэтым пытанні ідуць насустрач. І хаця першы наш крэдыт быў няўдалы, мы не спыніліся і потым узялі яшчэ адзін, які выкарысталі больш эфектыўна. Тым больш, для аграсядзіб грошы даюць на 7 гадоў толькі пад 5% гадавых. Лічыце, задарма». Галоўнае — рабіць усё цікава, прыдумляць што-небудзь новае, прыцягваць іншых да сваёй справы. Напрыклад, Васіль Фралоў дапамагае мясцовым майстрам прадаваць свае вырабы ў якасці сувеніраў — агульная выгада. Ды і проста больш дастойна: «А то што ж гэта? Па ўсім свеце сувеніры кітайскія. Жах! Мы прадаём толькі тое, што робяць мясцовыя жыхары», — падкрэслівае гаспадар.

### Эх, дарогі...

Як ні смешна, але гэта насамрэч самая вялікая праблема для аграсядзіб. Добрых дарог да гэтых мясцін няма. А тут жа ходзяць вялікія аўтобусы з турыстамі. Зімою ці восенню бывае так, што і выехаць немагчыма. «У мяне яшчэ добра, што сусед на бульдозеры працуе. Дык ён сабе расчысціць — і я езджу». Анатоль Ганец, гаспадар аграсядзібы «Ганка», таксама кажа, што дарогі — гэта вялікая праблема: «Мы, дарэчы, узялі крэдыт і насыпалі дарогу самі — 526 метраў. Трэба сказаць, што выканкам дапамагае з дарожнымі службамі дамаўляцца. Ніколі не адмовяць да нас заехаць, калі чысцяць асноўную дарогу». Не хапае і добрых указальнікаў на дарогах. Па словах гаспадара, з-за адсутнасці знакаў сядзібы цяжка адшукаць.

### Цешча як рухавік прагрэсу

«Купілі дамок на хутары. Самі для сябе, каб можна было прыязджаць і адпачываць у выхадныя. А потым аднойчы прыехала цешча да нас з Каўказа. Прыехала, паглядзела, сказала, што тут, у Беларусі, выдатная прырода. А чаму б не прымаць гасцей, як гэта робяць на Каўказе ў курортных гарадах? Так і пачалі», — распавядае Анатоль Ганец, старшыня грамадскага савета па развіцці сельскага турызму Валожынскага раёна. «Ганка» — гэта адна з найбольш «прасунутых» сядзіб: «Мы адышлі ад таго, што аграсядзіба — гэта месца, куды можна прыехаць у лазні папарыцца, гарэлкі папіць — і ўсё. Гэта ўжо ўчарашні дзень. Людзі сталі іншыя, у іх іншыя прыярытэты і інтарэсы. Мы стварылі грамадскі савет і праз паўтара года пасля гэтага зрабілі першую ў Беларусі кластарную сістэму развіцця аграэкатурызму. Кожны стаў займацца нечым сваім. Калі ў мяне няма месца, то я цяпер магу і да калегі адправіць людзей. Ці мы, напрыклад, проста пытаемся ў нашых турыстаў, куды яны хочуць, і прапануем некалькі варыянтаў на выбар».



Анатоль Ганец.

«Каб «прасоўваць» рэгіён, мы стварылі інфацэнтр. Калі нам тэлефануюць і хочуць правесці нейкае мерапрыемства, то мы прапануем адно, другое. Транспарт трэба? Калі ласка. І транспарт з нашага раёна. Навошта з Мінска браць? Тут трэба ўсё развіваць. У ганчароў была раней праца толькі на «Дудуткі», а сёння мы стаім у чарзе па іх прадукцыю», — з захапленнем кажа Анатоль Ганец.

### Нямецкае вяселле ў беларускім стылі

Сёлета гаспадарам «Ганкі» давялося ладзіць беларускае вяселле для немцаў, бо нявеста паходзіла з Беларусі і жадала ажаніцца на радзіме. Госці былі ў зачараванні ад вянчання ў Ракаве, ад абрадавых песень падчас святкавання ў сядзібе. Усе проста плакалі ад замілавання. Ад немцаў паступіла заяўка і на наступны год на падобнае вяселле — так ім спадабалася ўсім. Вось вам і праца на імідж краіны.

І зусім іншая справа — наступнае: «Тыдзень таму зусім выпадкова ўбачыў за восем кіламетраў ад Мінска знакі «Аграсядзіба». Паехаў па іх. І прыехаў да вялікага катэджа ў вёсцы. Там надпіс «VIP-саўна». Я зайшоў і спытаў, ці можна ў іх спыніцца. «Не, — кажуць, — тут толькі саўна. Нікога на ноч не пакідаем». Пытаюся, колькі каштуе. «200 долараў у гадзіну. А ў выхадныя — 250», — адказваюць. Неабходна гэта ўсё размяжоўваць — турызм і здачу ў наём саўны. Ёсць жа розніца: плаціць адну базавую велічыню ў год ці выплачваць усе падаткі», — незадаволена заўважае гаспадар аграсядзібы.

### Трэба выкарыстоўваць усе магчымасці

Развіццё нават адной аграсядзібы можа паспрыяць развіццю многіх іншых сфер дзейнасці ў раёне. Напрыклад, гаспадарам «Ганкі» няма калі займацца вырошчваннем свайго ўраджаю, а карміць жа людзей трэба. «Летась я прыехаў да аднаго мясцовага фермера і сказаў, што мы хочам купіць бульбу. Умоўна кажучы, яна для ўсіх каштавала 1300 за кілаграм, а мы прапанавалі за 750-800 рублёў даць нам адразу 22 тоны. І фермер пагадзіўся, бо для яго гэта больш выгадна. Цяпер ён ужо сам тэлефануе і пытаецца, колькі будзем браць», — адкрывае сакрэты Анатоль Ганец.

### Галоўнае — знайсці сябе

«Крэдыты на развіццё аграсядзібы даюць практычна ўсім, хто жадае. Галоўнае — даказаць працоўнай групе, якая прымае рашэнне, што ідэя акупіцца. Для гэтага трэба добра распрацаваць бізнес-план, — тлумачыць Пётр Бібік, намеснік старшыні Валожынскага райвыканкама. — Адмаўляем вельмі рэдка ў атрыманні крэдыту. Бывае і такое, што крэдыт атрымаюць, пабудуюць штосьці, а пасля не едуць да іх людзі — і ўсё. Значыць, не знайшлі сябе, дрэнна прадумалі сваю ідэю. У раёне зарэгістраваны 24 аграсядзібы. З іх паспяхова функцыянуе толькі 12, астатнія — у стадыі развіцця». Нагадаем, што Белаграпрамбанк, які вызначаны для падтрымкі аграэкатурызму Указам Прэзідэнта №372, дае крэдыты ў суме да 2000 базавых велічынь на тэрмін да сямі гадоў з працэнтнай стаўкай 5% гадавых.

### Не ўсё тое аграсядзіба, што на прыродзе

Гэтая думка ў мяне з'явілася пасля візіту ў яшчэ адно месца. Аздараўленчы комплекс «Сасновая», які належыць ЧУП «Азярэцкі-Агра», безумоўна, знаходзіцца ў жывапісным ляску. Але ж высокі жалезны плот, выкладзеныя пліткай вуліцы з бардзюрамі сведчаць аб тым, што гэта не аграсядзіба. Нават выдатныя драўляныя дамы не змогуць мяне пераканаць у адваротным.

«Тут вельмі прыгожыя, утульныя гасцінічныя нумары. Асноўны кірунак — сямейны адпачынак. Часта прыязджаюць да нас на выхадныя. Хацелі зрабіць гаспадарчы двор, але ж ад яго быў бы непрыемны пах», — расказвае дырэктар «Азярэцкі-Агра» Ніна Жалязнова. Пастаянная наша чытачка, якая вельмі любіць беларускую мову і добра на ёй размаўляе, імкнулася мне давесці, што гэты комплекс таксама адносіцца да агратурызму. Аднак я застаўся пры сваім меркаванні. Падумайце самі: калі сярод прыроды з'яўляюцца залішнія выгоды цывілізацыі, калі нельга прайсціся па зямлі, а толькі па плітцы, не будзе адчування далучанасці да сельскага духу. Мне здаецца, што трэба яшчэ размяжоўваць падобныя комплексы, якія таксама выконваюць сваю функцыю, і сапраўдныя аграсядзібы. Таму, калі вы захочаце распачаць сваю «аграсядзібную» справу, добра ўсё прадумайце. Знайдзіце «фішку» і не імкніцеся да чагосьці вельмі вялікага: лепш утульнасць і натуральнасць.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, фота аўтара.**

*Валожынскі, Смалявіцкі раёны.*



У аграсядзібе «Ганка» аддаюць перавагу актыўнаму адпачынку: сёлета вырашылі нават стварыць «вяровачны гарадок».



Ніна Жалязнова.

# СТАРТУЕ БЕЛАРУСКІ ТРАНСПАРТНЫ ТЫДЗЕНЬ

**Праходзіць ён будзе з 8 па 10 кастрычніка ў Мінску. «Павялічваецца значэнне транспартнай лагістыкі, чыгункі, таму мерапрыемства прымае больш шырокі фармат. Беларускі транспартна-лагістычны форум, які мы праводзілі на працягу шасці гадоў, зараз пераўтвораны ў Беларускі транспартны тыдзень. Для нашай краіны гэта асабліва важна, бо Беларусь знаходзіцца ў цэнтры транспартнай сеткі», — адзначае начальнік упраўлення каардынацыі транспартных сістэм, ліцэнзавання і лагістыкі Міністэрства транспарту і камунікацый Павел БАЖАНАЎ.**

Адным з галоўных мерапрыемстваў стане Беларускі транспартна-лагістычны кангрэс, на якім будуць абмяркоўваць перспектывы развіцця міжнародных транспартных калідораў праз тэрыторыю Беларусі, развіццё лагістычнай інфраструктуры і рынку лагістычных паслуг.

Адбудуцца шматлікія семінары і канферэнцыі, падчас якіх удзельнікі разгледзяць пытанні развіцця мультымадальных перавозак, выкарыстоўвання інфармацыйных і навігацыйных тэхналогій для павышэння якасці лагістычных і транспартных паслуг. На спецыялізаваным семінары прадставяць вынікі міжнароднага праекта «Лагістыка бурштынавага ўзбярэжжа», у якім прымалі ўдзел 19 арганізацый з Германіі, Літвы, Латвіі, Польшчы, Даніі і Беларусі. На канферэнцыі Беларускага саюза транспартнікаў у форме дыскусіі абмяркуюць праблемы развіцця грамадскага транспарту.

Упершыню ў Беларусі будзе праведзены міжнародны чыгуначны лагістычны бізнес-форум «Стратэгічнае партнёрства 1520: Цэнтральная і Усходняя Еўропа», генеральным партнёрам якога з'яўляецца адкрытае акцыянернае таварыства «Расійская чыгунка». «Асноўная тэма форуму — развіццё транзіту на бліжэйшую перспектыву, — паведаміў **начальнік службы знешніх сувязяў Беларускай чыгункі Аляксандр СЕРГІЕНКА**. — Удзельнікі сустрэчы — гэта кіраўнікі найбуйнейшых чыгуначных кампаній свету. Таксама для сумесных перамоў мы чакаем прадстаўнікоў міжнародных транспартных арганізацый». Напрыклад, Расійская Федэрацыя і Казахстан вельмі зацікаўлены ў стварэнні кантэйнернага бізнесу разам з нашай краінай. Удзельнікі форуму ацэняць сітуацыю ў Беларусі і яе здольнасць стаць часткай такога бізнесу. Каля 90% усіх чыгуначных перавозак Беларусь ажыццяўляе з Расіяй. Наша краіна знаходзіцца на стыку дзвюх транспартных сістэм. «Партнёры будуць вывучаць нашае транспартнае права. Адна з галоўных задач форуму — абмеркаваць магчымасць стварэння агульнага транспартнага права», — дадаў Аляксандр Сергіенка.

Праграма тыдня таксама прадугледжвае правядзенне Міжнародных спецыялізаваных выстаў «Транспарт і лагістыка» і «Лагістычны інжынерынг». Іх удзельнікі прадэманструюць сучасныя транспартныя сістэмы і абсталяванне для іх, тэхналогіі і тэхніку для праектавання, будаўніцтва, рамонту і абслугоўвання разнастайных відаў транспартных камунікацый, паслугі па перавозцы грузаў і пасажыраў.

Па ініцыятыве Навукова-тэхналагічнай асацыяцыі «Інфапарк» адбудзецца міжнародная канферэнцыя-выстава «Электронныя паслугі і інфармацыйныя сістэмы для транспарту і лагістыкі — «IT2TL-2013». «Яна стане працоўнай пляцоўкай, якая аб'яднае тых, хто прапаноўвае, і тых, каму патрэбны інфармацыйныя тэхналогіі. Мы абмяркуем, як транспартным і лагістычным кампаніям павысіць эфектыўнасць працы сваіх прадпрыемстваў», — паведаміў аб планах **Уладзімір БАСЬКО, генеральны дырэктар асацыяцыі «Інфапарк»**.

Цікавасць да форуму расце. Аб гэтым сведчаць лічбы. Калі летась было каля 100 удзельнікаў з 9 краін, то сёння прадэманстраваць свае дасягненні прыедуць больш за 120 кампаній з 15 краін.

**Вераніка ЦВІРКО.**

## ■ Здарэнне

### ЗАТРЫМАЛІ 14-ГАДОВАГА НЕЦВЯРОЗАГА СКУТАРЫСТА

**Міліцыянеры з патрульнай машыны ДАІ заўважылі падлетка, які ехаў на скутары без шлема ў вёсцы Пескі Бярозаўскага раёна.**

Яму загадалі спыніцца, але хлопец паддаў газу і спрабаваў уцячы. Праўда, ён не справіўся з кіраваннем, з'ехаў у кювет, кінуў скутар і пабег. Ды далёка не ўцёк. Высветлілася, што вадзіцель, 14-гадовы мясцовы жыхар, правоў на кіраванне, вядома, не мае. Да таго ж ён быў п'яны. Матэрыялы на кіроўцу і яго бацькоў перададзены ў інспекцыю па справах непаўналетніх.

**Яна СВЕТАВА**

# У ЧЫМ ПРЫЧЫНА ДАЎГАБУДУ?

**Бяром толькі тых, хто можа працаваць за траіх. І рабочыя з задавальненнем выходзяць на працу па выхадных, нават просяць: маўляў, толькі дайце што рабіць — выканаем. Пры гэтым да якасці ніякіх прэтэнзій.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Вось сёння некалькі чалавек прасіліся ў наш калектыў. Наогул працаўладкавацца ў райцэнтры цяжка. Ды і хто зможа столькі плаціць? Мы бяром толькі тых, хто можа працаваць за траіх. І рабочыя з задавальненнем выходзяць на працу па выхадных, нават просяць: маўляў, толькі дайце што рабіць — выканаем. Пры гэтым да якасці ніякіх прэтэнзій. Так, ёсць у нас і некаторыя з тых, хто прыехаў з Расіі. Такіх бяром, калі ёсць у іх паслугах патрэба, — працягвае будаўнік.

Па выніках імправізаванага «пасяджэння» ў адной з кватэр дома было вырашана, што яго абавязкова поўнасцю «давядуць да розуму» ўжо ў гэтым месяцы.

Членаў рабочай групы здзівіла, што, згодна з праектам, на першым паверсе на лоджыях устаноўлены рашоткі, дзверы пры ўваходзе ў кватэры — металічныя, а падлогі — драўляныя. І ўся гэтая «круцізна» на кошце квадратнага метра практычна не адбілася, бо праект тыпавы. Наконт тых жа металічных дзвярэй і іншага — улічылі пажаданні будучых навасёлаў. «Квадрат», паводле слоў кіраўніка КУП упраўлення капітальнага будаўніцтва райвыканкама, каштуе каля 6,1 мільёна рублёў.



Дом у Оршы.

У Оршы члены групы наведалі дом, які будуе льнокамбінат для сваіх працаўнікоў. «Няма фінансавання» — тая ж прычына даўгабуду. Віцебскай фірме, якая ўзяла «каробку» дома, запазычылі па розных ацэнках ад 2 да 3 мільярдаў рублёў. Увод у эксплуатацыю дома вышынёй у 8-10 паверхаў таксама планаваўся на верасень, а ўзводзіць яго пачалі летась у сакавіку.

Паводле слоў прадстаўніка заказчыка будаўніцтва — прадпрыемства «Аршанскі льнокамбінат», для завяршэння ўсіх работ трэба яшчэ 28 мільярдаў рублёў, а выдаткавалі каля 26 мільярдаў. Зразумела, дом на 90 кватэр, з фірменнай крамай на першым паверсе, будзе дабудаваны, калі прадпрыемства знойдзе грошы... А пакуль што каля дома на вуліцы Савецкая прастойвае вежавы кран, рабочых на аб'екце няма.

### Эксперыментальны «цёплы» дом

У Віцебску члены групы наведалі два дамы. Першы — на 188 кватэр у новым спальным раёне на ўскраіне абласнога цэнтра. Зараз тут працуюць 300 чалавек у дзве змены. Так, здаць своечасова дом не паспелі, але ўжо хутка будаўнікі адсюль сыдуць. Квадратны метр для тых, хто атрымаў ільготныя крэдыты, каштуе 6,8 мільёна рублёў.

Наступны 5-павярховы мансардны 60-кватэрны дом — унікальны: апалубка пасля выканання бетонных работ застаецца ўнутры. Гэта, безумоўна, адбіваецца на цане будаўніцтва. Але, як патлумачылі спецыялісты, будынак захоўвае больш цяпла. Эксперыментальны — першы ў вобласці такі дом — будуе прыватная фірма. Кватэру тут можна купіць па рынычнай цане. Чаму дом яшчэ не заселены? Тым больш што знаходзіцца ў вельмі прывабным месцы: побач садок, дзіцячая паліклініка, недалёка галоўная плошча горада. Як растлумачыў прадстаўнік заказчыка-падрадчыка будаўніцтва, каб усё дарабіць, нядаўна ўзялі крэдыт. І ў кастрычніку «кроў з носу, а дом будзе здадзены «пад ключ». Цікава, што, нягледзячы на элітнасць, «квадрат» каштуе менш за 1,2 тысячы долараў.



Дом у Віцебску.

Аляксандр Сонцаў, намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства «Галоўдзяржбудэкспертыза», член рабочай групы, якая адсочвае стан спраў па жыллёвых даўгабудах у Віцебскай вобласці, адказваючы на пытанні карэспандэнта «Звязды», адзначыў, што ў мінулы раз маніторынг праблемных дамоў праводзіўся ў жніўні. Чарговая «праверка» зроблена, каб высветліць, што змянілася, вызначыць на месцы з удзелам усіх зацікаўленых бакоў канкрэтныя тэрміны завяршэння даўгабуду.

— Наведваем аб'екты, якія не ўпісаліся ў графік здачы. Гэта кантрольная праверка, — сказаў ён. — Будзем і надалей сачыць за выкананнем абавязацельстваў па ўводзе жылля. Праблемы Віцебскай вобласці ў гэтым пытанні асабліва не адрозніваюцца ад тыповых па краіне: няма фінансавання, затрымкі крэдытавання...

Па апошняй інфармацыі, у Прыдзвінскім краі засталіся 23 жыллёвыя даўгабуды.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.**

*Талачын — Орша — Віцебск.*

## ■ Цэны

### Тарыф на цяпло і гарачую ваду павялічыўся на 3%

**Пра гэта гаворыцца ў пастанове Савета Міністраў № 849, што афіцыйна апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Такім чынам, тарыфы на цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння ўзраслі з пачатку кастрычніка на 3% да 70 898,5 рубля за 1 Гкал. Гэтым дакументам пастановы вызначаюцца новыя тарыфы на прыродны і звадкаваны газ.

Цяпер кошт прыроднага газу, што выкарыстоўваецца ў жылых дамах і кватэрах, а таксама ў садовых дамах (дачах) членаў садоўніцкіх таварыстваў з усталяванымі прыборамі індывідуальнага ўліку расходу газу, пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў і газавых воданагравальнікаў складае 404,3 рубля за 1 куб.м у ацяпляльны перыяд і 1 232,4 рубля за 1 «куб» — у летні. Для жылля, не абсталяванага прыборамі індывідуальнага ўліку расходу газу, тарыф з аднаго жыхара за месяц устаноўлены ў памеры 9 850 рублёў пры наяўнасці газавай пліты і цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння або індывідуальнага воданагравальніка (за выключэннем газавага). У выпадку наяўнасці газавай пліты і газавага воданагравальніка (пры адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння) тарыф складае 28 350 рублёў. Да 16 тысяч павялічыўся тарыф на газ пры наяўнасці газавай пліты і адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння і газавага воданагравальніка.

Памяняліся і тарыфы на звадкаваны газ, які выкарыстоўваецца ў жылых дамах і кватэрах. На газ звадкаваны, які выкарыстоўваецца ў жылых дамах і кватэрах з усталяванымі прыборамі індывідуальнага ўліку расходу газу, пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў і (або) газавых воданагравальнікаў тарыф складзе ў ацяпляльны перыяд 7 360,7 рубля за 1 куб.м, у летні перыяд — 3 286,3 рубля; пры адсутнасці індывідуальных ацяпляльных прыбораў тарыф складзе 3 286,3 рубля за 1 куб.м незалежна ад ацяпляльнага перыяду.

Падаражэў у кастрычніку і звадкаваны газ у балонах. Цяпер кілаграм такога паліва каштуе 2 700 рублёў, а балон вагой 21 кг — 56 700 рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение**

**«Минскстрой»**

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ**

**объекта «Многоэтажные жилые дома №№ 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул. Щорса–пр. Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану». (3 пусковой комплекс) в г. Минске,**

*опубликованную в газете «Звязда» 18 февраля 2012 года:*

УНП 100071325

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений № 125, № 132, № 169, № 193, № 205, № 206 без выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, в текущих ценах составляет: 1-комнатных квартир – 14 551 674 рубля, 2-комнатных квартир – 14 053 533 рубля, 3-комнатных квартир – 13 555 393 рубля.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*



15 октября 2013 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. О внесении изменений в устав и утверждении устава общества в новой редакции.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 09.10.2013 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества. Совет директоров.

УНП 200050191



## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение**

**«Минскстрой»**

**220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**

**режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел.: 327-52-36, 226-03-01**

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3-х лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- ул. Чичурина, д. 6 – 10 мес., ул. Чичурина, д. 12 – 11 мес., ул. Чичурина, д. 14 – 18 мес., ул. Чичурина, д. 18 – 17 мес., ул. Чичурина, д. 20 – 27 мес., пр-т газеты «Правда», д. 3 – 24 мес., ул. Панченко, д. 10 – 11 мес., ул. Панченко, д. 10А – 12 мес., ул. Матусевича, д. 56 – 23 мес.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Строительство многоквартирных жилых домов типовых потребительских качеств №№ 9, 11 (по генплану) со встроенно-пристроенными помещениями в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемой». Жилой дом № 11 по генплану.**

Свидетельство (удостоверение) № 500/938-4189 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 11 ноября 2011 года.

Земельный участок площадью 0,1464 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Проектом предусматривается строительство крупнопанельного, односекционного, 18-этажного, 112-квартирного жилого дома в конструкциях серии М 111-90 со встроенными помещениями отделения банка.

Начало строительства жилого дома – июнь 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – октябрь 2014 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 26.05.2011 № 387-60/11 с дополнением № 02-1154 от 16.06.2011.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир № 1, № 2, № 7, № 8, № 9, № 14, № 15, № 16, № 21,№ 22, № 23, № 28, № 29, № 30, № 35.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с учетом выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

14 643 796 руб. – на 1-комнатные квартиры;
14 234 165 руб. – на 2-комнатные квартиры;
13 824 534 руб. – на 3-комнатные квартиры.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений.

Договор строительного подряда от 10.04.2013 № 120С-04-13, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*

■ Медыяперсона

Вікторыя КАСЯНЮК:

# «ШТО Б ТЭЛЕБАЧАННЕ НІ РАБІЛА, ЯНО ЗАБАЎЛЯЕ»

**Выбар прафесіі ў яе адбыўся яшчэ ў 5 класе — пасля публікацыі ў дзіцячай газеце «Казкі пра мушку Машку». Цікава, падумала я, ці ўзгадае наша гераіня — цяпер тэлевядучая праграмы «Рэпарцёр «Беларускай часінкі» на «Беларусь 2», аб чым ішла гаворка ў той дзіцячай спробе пяра? Уласна, пра гэта найперш і спыталася.**

— Гэта была біяграфія мушкі, — ні на імгненне не задумваецца Віка. — Дакладней, у мяне быў цэлы сшытак, амаль кніжка, дзе па алфавіце ішлі розныя героі: гусь Гена, бегемот Бора. І я пра кожнага прыдумвала гісторыю. Потым папрасіла бацькоў, каб яны знайшлі адрас «Зоркі», і мы з татам пайшлі ў рэдакцыю... Трапілі да галоўнага рэдактара. Яна пачытала мае сачыненні і неяк так пранікліся, што надрукавала іх. Дарэчы, «мушка Машка» ўвайшла ў «партфоліа», з якім я і паступала на журфак.

## Забаўляць, дапамагаючы

***— Ты з першага курса ў прафесіі, больш як 15 гадоў у эфіры, радыёпрэмію Папова «ўзяла», тэлевізійнымі ўзнагародамі адзначылася. А якімі сваімі работамі асабліва ганарышся?***

— Мой любімы рэпартаж — «Дом анёлаў», які атрымаў летась узнагароду на міжнародным тэлевізійным форуме «Разам». Бо гэты аповед пра выхаванцаў Васілішкаўскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця дапамог змяніць лёс адной дзяўчынкі. Яна знайшла сваякоў. І хоць, на жаль, мама і сястра з ёю так і не сустрэліся, затое адшукаліся бабуля і дзядзька, а потым выйшла на сувязь цётка, вельмі заможная жанчына, якая жыве ў Маскве. Там была гісторыя з працягам: цётка запрасіла дзяўчынку ў Маскву, падарыла ёй камп'ютар, а потым, наколькі я ведаю, мела намер выканаць вялікую мару дзяўчынкі — звазіць яе на мора... Напэўна, у кожнага чалавека павінна быць свая добрая чараўніца ў жыцці. У гэтай дзяўчынкі яна з'явілася. Мы двое сутак правялі ў доме-інтэрнаце, дзеці хадзілі за намі след у след, плакалі, калі давялося развітвацца. Некаторыя дагэтуль тэлефануюць, мы сябруем. І гэта вельмі прыемна і кранальна...

Яшчэ быў рэпартаж на тэму дабрачыннасці. Мы распавялі гісторыі дзяцей, на лячэнне якіх былі патрэбныя вялікія сумы. Сярод іх быў хлопчык з 4-й стадыяй раку. Мы збіралі яму на лячэнне грошы, зладзілі сустрэчу з вядомымі беларускімі спартсменамі, бо ён вельмі захапляўся спортам; тыя пералічылі вялікую суму на рахунак, але грошай на аперацыю ўсё адно не хапала. Маці павезла яго ў Ізраіль на лячэнне, не прыпыняючы збор грошай, спадзеючыся на цуд. Пэўны час мы шчыльна кантактавалі, потым яна знікла. Не так даўно я даведалася з інтэрнэт-крыніц, што хлопчык памёр... Калі зараз пераглядаеш той рэпартаж, дзе мы размаўлялі з ім пра смерць, размова набывае зусім іншы сэнс. Гэта жудасна! Дзеці не павінны паміраць у такім узросце, калі і жыцця яшчэ як след не пабачылі... Адзінае, на што я спадзяюся, што мы ўсё ж зрабілі жыццё таго хлопчыка хоць крыху больш светлым і мелі дачыненне да канкрэтнай дапамогі. Бо тэлебачанне павінна дапамагаць людзям, хоць, натуральна, мы і не «хуткая дапамога», не міліцыя... Ведаю, што дагэтуль людзі, якія адгукнуліся пасля эфіру, дапамагаюць іншаму дзіцяці (хвораму на «сіндром матылька»), якому патрэбны пастаянны догляд і нятаннае лячэнне... Для мяне гэта вельмі важна. Значыць, што праца была не дарэмнай, сюжэты знайшлі водгук і мелі працяг у жыцці.



Фота www.belarus2.by

***— Вось ты кажаш: тэлебачанне павінна дапамагаць людзям. Але ж некаторыя выкарыстоўваюць СМІ як выключна адзіны інструмент вырашэння праблем. У «Беларускай часінцы» часта даводзілася сутыкацца з «прафесійнымі скаржнікамі»?***

— Так, у нас у «Рэпарцёры» нават быў асобны сюжэт пра такіх аматараў скардзіцца, якіх у іх гарадах і мястэчках ужо ведаюць усе крамы, рэстараны ды афіцыйныя ўстановы. І калі я сядзела на «гарачай лініі» ў праграме «Беларуская часінка», адбываліся такія дыялогі: «Алё, вы не ведаеце, што трэба зрабіць, каб прыватызаваць кватэру? — А вы не спрабавалі звярнуцца да юрыста? — А, можна патэлефанаваць юрысту? Тады падкажыце тэлефон!». Здаецца, некаторым прасцей набраць тэлефон «гарачай лініі», чым самім разабрацца ў элементарнай сітуацыі: звярнуцца ў ЖЭС, у таварыства абароны правоў спажыўцоў, і г.д.

***— Беларускія гледачы, па выніках сацыялагічных апытанняў, мяркуюць, што тэлебачанне павінна выконваць як забаўляльную, так і інфармацыйную, асветніцкую і выхаваўчую функцыю. На твой погляд, што павінна стаяць першым?***

— Цяпер існуе такая тэндэнцыя: што б тэлебачанне ні рабіла, нават калі аказвае дапамогу, яно ўсё адно забаўляе. Бо ўся інфармацыя, якую мы падаём гледачу, павінна быць цікавай, прывабнай у любым сэнсе, каб чалавеку не стала сумна і ён не пераключыў альбо ўвогуле не выключыў тэлевізар. А што цікава? Слёзы, скандалы, секс, смех — усе гэтыя «правілы С» працуюць. Гэта даўно вынайдзены веласіпед, пацверджаны мноствам даследаванняў і раскрыты ў мностве кніг. І мы забаўляем. Гэта не дрэнна, мне здаецца, наадварот, вымушае развівацца і шукаць новыя павароты.

**— Акрамя «Рэпарцёра беларускай часінкі», ты рабіла «Дзённікі Еўрабачання», вяла для радыё агляды-дзённікі «Славянскага базару» і г.д. Што было цікавей — працаваць у забаўляльным жанры, з капрызнымі «зоркамі» альбо ў праблемнай сацыяльнай тэме, дзе заўсёды маем аддачу аўдыторыі?**

**12.45** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**14.35** Пятая передача.
**15.30** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**16.25** Магія Бена Эрла.
**17.50, 4.45** Як гэта зроблена?
**20.05** Беар Грылс: па слядах тых, хто выжыў.
**21.00** Смяротны ўлоў.
**23.00, 23.30, 3.30, 3.55** Ашалелая рыбалка.
**0.00** Вулічныя гонкі.
**0.55** Хлопцы з гарматамі.
**1.50** Мафія амішаў.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.
**5.10, 5.40** Паляўнічыя на склады.

## НЯДЗЕЛЯ, 13 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.20 Камедыя «Формула кахання».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Арсенал.
**9.35, 0.20 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**12.10** Зона Х.
**12.45** Каробка перадач.
**13.20** «Урачэбныя тайны».
**13.55** Заўтра — гэта мы!
**14.25** «Terra incognita. Беларусь невядомая».
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Клуб рэдактараў.
**16.15** Спецыяльны рэпартаж АТН.
**16.35 Камедыя «101 далмацінец».**
**18.20** «Мая праўда». «Нона Мардзюкова. Ненавіджу быць моцнай».
**19.20 Камедыя «Аб чым маўчаць дзяўчаты».**
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Журналісцкае расследаванне.
**22.35** Урачыстае закрыццё Міжнароднага музычнага фестывалю «Залаты шлягер-2013 у Магілёве».

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.30** М/ф «Дзядзька Міша», «Аб тым, як гном пакінуў дом», «Праметэй».
**8.05 Фільм-казка «Чароўнае слова гонару».**
**9.20** Пазакласная гадзіна.
**9.40** Тэлебарометр.
**9.45 Камедыя «Будзьце маім мужам».**
**11.30 Камедыя «Касякі».**
**13.15 Камедыя «Блеф».**
**15.05, 23.10 Серыял «Таксі».**
**16.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**17.05** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Данбас».
**19.30** Суперлато.
**20.25** Навіны надвор'я.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10 Трылер «Масакра».**
**0.15** Спорт-кадр.
**0.55** Дзюдо. Кантынентальны кубак. Мужчыны.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 0.45** «Калейдаскоп».
**8.05** «Таямніца душы».
**8.40** «Маем рэчы». Космас Язэпа Драздовіча.
**8.55** «Вежы Наваградка». Дак. фільм.
**9.05** «Снег падае і растае...». Фільм-партрэт.
**9.50** «Запаведнымі сцежкамі беларускай зямлі». Дак. фільм.
**10.45** «Адысея Гашкевіча». Дак. фільм.
**11.10** «Тканіна жыцця». Дак. фільм.
**11.25** «Дзень Еўфрасінні».
**11.55** «Карані».
**12.25 Серыял «Адрынутыя». 1-я — 4-я серыі.**
**16.10** «Фатальнае падабенства. Трагедыя Андрэя Растоцкага».
**16.55, 22.10** «Культпрасвет».
**17.30 Дзіцячы фільм. «Пра дракона на балконе, пра дзяцей і самакат».**
**18.35 Сусветнае кіно. «Хрыстафор Калумб. Заваяванне Амерыкі». Драма.**



**20.30** Калыханка.
**20.55** VIII Міжнародны фестываль Юрыя Башмета. Салісты оперных тэатраў свету.
**22.35** «Усё ў садзе». Спектакль Дзяржаўнага акадэмічнага драматычнага тэатра ім. М. Горкага паводле твора Э. Олбі.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.50** «Фазэнда».
**11.25** «Вясельны пярэпалах».
**12.25** «Брэйн-рынг».
**13.25** «Залаты грамафон». Лепшае за 15 гадоў.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Куб».
**17.35** «Эстрадны кактэйль».
**18.50** «Я люблю Беларусь!».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.40** «Ледніковы перыяд».
**0.45 Камедыя «Маладыя».**

### СТБ

**6.15 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».**
**7.10 Драма «Шлях Карліта».**
**9.50, 16.50, 20.40** «Гарады, якія спяваюць».
**10.00, 17.00** «Аўтапанарама».
**10.30** «Тайны свету».
**11.30** «Вялікае снеданне».
**12.10** «Прывітанне, доктар».
**12.45 Маст. фільм «Безыменная зорка». 2-я серыя.**
**14.10** «Тэрыторыя памылак».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.30** «24 гадзіны».
**17.30** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**18.00** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**19.30** «Тыдзень».
**21.15 Маст. фільм «Маці і дзіця».**
**23.45 Маст. фільм «Наладчык».**

### МІР

**5.00 Маст. фільм «Пецька ў космасе».**
**6.05** М/ф.
**8.05** «Ведаем рускую».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.20** «Аэрасвет».
**9.35** «Прыгоды Македонскай».
**9.50** «Нітка да ніткі».
**10.10, 1.00 Маст. фільм «Сцяна».**
**13.10 Маст. фільм «Падкідыш».**
**15.10** Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**15.45, 21.30 Серыял «Застава Жыліна».**
**20.00** «Разам».
**21.30 Маст. фільм «Кактэбель».**



**23.20 Маст. фільм «Белая мядзведзіца».**
**4.05** «Цюркі Расіі».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Ці ў садзе, у агародзе».**
**10.10** «Сам сабе рэжысёр».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.15** «Смехапанарама».
**11.45** «У свеце жывёл».
**12.20** М/ф «Маша і мядзведзь».
**12.35 Маст. фільм «Звычайны цуд». 2-я серыя.**
**14.15** «Гарадок». Дайджэст.
**14.45 Маст. фільм «Русалка».**
**18.15** «Смяяцца дазваляецца».
**21.25** «Наш выхад!».
**23.10** «Нядзельны вечар».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.30 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**8.20** «Дзікі свет».
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Ядзім дома!».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.25** «Паедзем, паядзім!».
**11.55** «Цуд тэхнікі».
**12.30** «Першая передача».
**13.20 Маст. фільм «Мёртвыя душы».**
**15.05 Серыял «Важняк».**
**16.45** «Вочная стаўка».
**17.40** «Ворагі народа».
**18.25** Надзвычайнае здарэнне.
**19.00** «Сёння. Падагульняючая праграма».
**19.50 Баявік «Антыснайпер. Стрэл з мінулага».**
**21.40** «Новыя рускія сенсацыі».
**22.40** «Ты не паверыш!».
**23.35** «Як на духу».
**0.25** «Луч Света».
**0.55** «Школа зласлоўя».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.05, 19.05, 21.00, 23.30** «Надвор'е».
**9.05, 15.00** Мультпарад.
**9.30** «Мой любімы гадаванец».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30** «VR дайджэст».
**11.00 «Сінематограф». Камедыя «У джазе толькі дзяўчаты».**
**13.10 Трылер «Пагоня».**
**15.15 Серыял «Камісар Рэкс».**
**17.00** Ток-шоу «Бульбокс».
**17.30 Серыял «У стылі Джэйн».**
**19.10 Трылер «Уваскрэсенне».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.10 Баявік «Закон добласці».**
**23.15** «Кінаблакнот».

### ВТБ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/с «Смяшарыкі».
**8.30 Серыял «Татавы дочкі».**
**9.30, 16.30 Серыял «Асцярожна, дзеці!».**
**10.30** «Вясёлыя гісторыі з жыцця».
**11.00 Серыял «Аднакласнікі».**
**11.30** «З'ешце гэта зараз жа».
**12.00, 23.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.30, 0.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.00, 0.00** «Улётнае відэа».
**13.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** «Жонкі алігархаў».
**15.00 Серыял «Супермакс».**
**17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**17.30 Серыял «Святлафор».**
**20.00** «Цэнтральны мікрафон».
**20.30** «Нерэальная гісторыя».
**21.00** «Уральскія пельмені».

### ІНТЭР+

**9.05, 6.40** Феерыя падарожжаў.
**9.30** Школа доктара Камароўскага.
**10.05, 5.00** Усё для мамы.
**10.40, 4.20** Арол і рэшка. Назад у СССР.
**11.25 Маст. фільм «Прыморскі бульвар».**
**13.35 Маст. фільм «Чаканне палкоўніка Шалыгіна».**
**14.55 Маст. фільм «Капітан Нэма».**
**18.20, 23.30** Легенды крымінальнага вышуку.
**18.50, 21.30, 0.40 Маст. фільм «Будні і святы Серафімы Глюкінай».**
**20.00, 3.00** Падрабязнасці тыдня.
**22.45** Дак. серыял «Украіна. Забытая гісторыя».
**0.00** Дак. фільм «Тайны пірамід».
**5.30 Маст. фільм «Вялікае золата містара Грынвуда».**

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00, 23.00** «Вера, надзея, каханне і... нянавісць». Дак. фільм.
**5.45** «І жартам, і ўсур'ёз». 1988 год.
**6.30 «Пасылка для Святланы». Маст. фільм.**
**7.45** «Вальс аб вальсе». Фільм-канцэрт.
**8.00, 2.00** «Час».
**9.00** «Колба часу».
**10.00** «Кінапанарама». 1984 год.
**11.00** «Быў час». 2008 год.
**12.00** «Вернісаж Ілы Рэзніка». Канцэрт.
**13.15** «КВЗ-87». 1987 год.
**15.00** «Гульцы». Тэлеспектакль. 1978 год.
**17.00** «Ленан з намі». 1990 год.
**17.55, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.55** «Вечар у Дзяржаўным Акадэмічным тэатры ім. Вахтангава». 1991 год.
**20.00** «Асаблівы падыход». Фільм-канцэрт. 1959 год.
**21.10** «Праграма «А». 1990 год.
**23.30** «На струнах і клавішах». Фільм-канцэрт.
**0.00** «Поле цудаў». 1992 год.
**0.40 «Жыццё і смерць дваране Чартапханава». 2-я серыя. Маст. фільм.**
**4.00** «Зорны дыск». Канцэрт.

### EUROSPORT

**9.30, 9.45, 17.35, 18.50, 1.45** Веласпорт.
**11.45** Тэніс. Матс-пойнт.
**12.15, 13.15, 14.00, 14.45, 20.00** Футбол. Кваліфікацыя на чэмпіянат свету 2014.
**15.30** Тэніс. WTA. Фінал.
**17.30** Перавага свайго поля.
**21.00** Дартс.
**1.30, 2.15** Мотаспартыўны ўік-энд.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетч-ком «Паміж намі».
**5.20, 12.55, 21.00** Камедыя «Пародыя на Кармэн».
**6.15** Прыгоды «Дарога ў Марока».
**7.40, 10.40, 13.45, 15.45, 16.45, 21.50, 23.55, 1.50** «Камедыянты. Лепшае».
**8.00, 16.00, 2.25** Камедыя «Яго новая праца».
**8.40, 16.30, 3.00** Камедыя «Ні на што не прыдатны, або Яго новая прафесія».
**9.00** Камедыя «Проста сябры».
**11.15** Камедыя «Усе выраслі».
**14.10** Камедыя «На будоўлю, месье Танер!».
**17.20** Камедыя «Паліцэйскі і малы».
**19.20** Камедыя «Дзякуй, што патурбавалі».
**22.10** Камедыя «У нагу!».
**0.10** Прыгоды «Канваіры».
**3.20** Камедыя «Прывітанне, бывай!».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Фільм-казка «Салавей».
**3.25, 9.25, 15.25** М/с «Прыгоды капітана Врунгеля». Рускія народныя казкі. «Ліса і мядзведзь».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Магія». Казкі рускіх пісьменнікаў. «Чарадзейны пярсцёнак». Зборнік м/ф «Аднойчы». «Пясочны гадзіннік».
**5.00, 11.00, 17.00** М/ф «Калядныя казкі». Казкі замежных пісьменнікаў. «Чарадзейныя акуляры».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Нябесныя танцоры».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Як качаня-музыка стала футбалістам». «Цуда-дрэва».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.30, 5.10** Серыял «Сябры».
**10.40** Маст. фільм «Падарожжа Гулівера».
**12.15, 2.55** Маст. фільм «Некалькі дзён з жыцця І.І. Абломава».
**14.55, 1.15** Серыял «Вар'яты».
**16.55** Маст. фільм «Рэальная казка».
**19.00** Маст. фільм «Ізгой».
**21.55** Маст. фільм «Рэмба 3».
**23.50** Серыял «Жарабец».
**0.30** Серыял «Кліч крыві».

### ТБ1000

**5.00, 11.00** Жахі «Готыка».
**7.00** Драма «Маладая Вікторыя».
**9.00** Фантастыка «Зыходны код».
**13.00** Камедыя «Пастка для нявесты».
**14.40** Драма «Усмешка Моны Лізы».
**17.00** Меладрама «Брудныя танцы 2».
**19.00** Баявік «Пад адхон».
**21.00** Баявік «Даміно».
**23.15** Драма «Спячая прыгажуня».
**1.00** Жахі «Воўк-адзіночка».
**3.00** Трылер «Чараўніцтва».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Камедыя «Гульня».
**8.00** Меладрама «Мой хлопец — анёл».
**10.00** Драма «Слон».
**11.50** Драма «У пачатку слаўных спраў».
**14.30** Камедыя «Атамны Іван».
**16.20** Меладрама «Кватарантка».
**18.00** Камедыя «Вяселле».
**20.00** Драма «Гогаль. Бліжэйшы».
**22.10** Трылер «Рускі трохвугольнік».
**0.20** Драма «Пустальга».
**2.00** Трылер «Камень».
**4.00** Камедыя «Ушчэнт».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Тайна марского д'ябла.
**6.00** Злавіць сома.
**7.00** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
**8.00** Дзікі тунец
**9.00** Каралі рыбалкі.
**10.00, 10.30, 11.00, 11.30, 13.00, 13.30, 16.00, 16.30** Гульні розуму.
**12.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**14.00** Дзікія жывёлы Поўначы.
**15.00** Адзін акіян.
**17.00, 18.00, 19.00** Малпачалавек.
**20.00, 21.00, 0.00, 1.00, 3.00, 4.00** Машыны: разабраць і прадаць.
**22.00** Мегазаводы.
**23.00, 2.00** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**7.00, 8.15** Як гэта ўстроена?
**7.25, 3.30** Пен і Тэлер, праўда і хлусня.
**8.40, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.10** Смяротны ўлоў.
**10.05, 10.30** Ашалелая рыбалка.
**11.00** Беар Грылс: па слядах тых, хто выжыў.
**11.50, 21.00** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**12.45, 20.05** Разбуральнікі легенд.
**13.40, 0.55** Скрозь кратовую нару.
**14.35, 0.00** Цуды Сонечнай сістэмы.
**15.30, 1.50** Адваротны бок хаосу.
**16.25, 16.55, 17.20, 18.15, 18.45** Паляўнічыя на рэліквіі.
**19.10, 19.40** Лепшыя ў сваёй справе.
**22.00** Магія Бена Эрла.
**23.00, 2.40** Невытлумачальнае: спецыяльныя матэрыялы.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.
**5.10** Пятая передача.
**6.05** Майстэрня «Фантом Уоркс».

■ Аўра даўніны

# НЯСВІЖСКІЯ СЛАВУТАСЦІ: КУЛЬТУРА ПЛЮС РАЗЛІК

**Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» у асаблівай рэкламе патрэбы не мае: сёння гэта самы наведваемы культурны аб'ект у краіне. Калі летась нясвіжскія славутасці наведала 431 тысяча гасцей, то сёлета плануецца ўжо каля паўмільёна. Мара дырэктара музея-запаведніка, кандыдата гістарычных навук Сяргея КЛІМАВА, — дачакацца мільёна наведвальнікаў у год і зрабіць Нясвіж сапраўдным горадам-музеем.**



Будучы дырэктар прапанаваў праграму развіцця запаведніка, якая прадугледжвае стварэнне новых музеяў (прыватных калекцый і дзіцячага), распрацоўку новых турыстычных аб'ектаў і маршрутаў, істотнае папаўненне фондаў. Гэта і дапамагло яму атрымаць адказную пасаду.

Як лічыць Сяргей Клімаў, маючы такую багатую гісторыю, Нясвіж сучасны павінен падстройвацца пад даўніну: гэта датычыць стварэння пешаходных зон, рэканструкцыі гістарычных будынкаў, добраўпарадкавання памятных мясцін. Вельмі дарэчы ў Нясвіжы было б і стварэнне горада майстроў. Прынамсі, на рынку гандляроў сувенірамі ён калі-нікалі ўзнікае — часта можна паназіраць за працай ганчароў (нават самому паспрабаваць сілы ў старажытным рамястве і крыху запэцкаць рукі ў гліне), разьбяроў, майстрых саламяных спраў і вышывальшчыц. Пры гэтым вельмі важна не парушыць тую аўру, якую мае ўся нясвіжская даўніна, — гэта прынцыповы падыход

**Сёння сюды, у Нясвіж, ідуць больш за тысячу найменняў сувеніраў і рознага кшталту падарункаў ад 76 пастаўшчыкоў.**

кіраўніка запаведніка, бо часам не ў патрэбным месцы абсталяваная гандлёвая кропка здольная істотна пагоршыць выгляд мясціны. Але тут, прызнаецца Сяргей Клімаў, «з мясцовай уладай і асабліва з Міністэрствам культуры адносіны будуюцца на аснове кампрамісаў і ўзаемаразумення таго, што Нясвіж — прызнаны аўтарытэт турыстычнай галіны».

## ВЫДАТКІ НА КУЛЬТУРУ

Вядома, такі буйны гісторыка-культурны музей-запаведнік патрабуе і адпаведнага фінансавання, а таксама, як падкрэслівае дырэктар, — неабходнай кваліфікацыі супрацоўнікаў. І невядома, што з гэтага больш важнае. Штат — 230 чалавек — нібы на добрым заводзіку. Гэта ўсе: ад дырэктара і да прыбіральшчыкаў і аховы. Значныя выдаткі з заробленага ідуць на аплату электрычнасці, камунальных паслуг, павышэнне заробкаў персаналу, утрыманне некалькіх трактароў і аўтамабіляў, іншай спецыяльнай тэхнікі: паспрабуйце пагрузіць і вывезці той жа снег з замчышча! Ды нарэшце — вельмі істотная справа — набыццё экспанатаў. Нясвіж быў, мякка кажучы, усхваляваны ў свой час, калі музей шырока прапанаваў сваё жаданне набыць ва ўсіх ахвотных прадметы даўніны — для будучага музея прыватных калекцый. Тут варта адзначыць, што на Гродзеншчыне музею ўжо ўдалося купіць калекцыю ў паўтары тысячы экспанатаў. Мне падалося, што дырэктар з гонарам сказаў аб тых 250 тысячах еўра, якія штогод адкладваюцца для папаўнення калекцый.

Што ж да павышэння кваліфікацыі сваіх падначаленых, Сяргей Клімаў перакананы, што вучыцца трэба лепшаму ў лепшых. А калі так — то навуковыя супрацоўнікі і экскурсаводы рэгулярна наведваюць мноства міжнародных форумаў па музейнай справе. Комплекс мае сталыя стасункі з Метрапалітэн-музеем, з Эрмітажам і Музеем Маскоўскага Крамля. Менавіта з замежжа прыйшоў вопыт стварэння аўдыягідаў — іх цяпер тут каля 190 на некалькіх мовах. Такой раскошай таксама не пахваліцца ніводны музей краіны.

Калі адчыніліся дзверы комплексу пасля рэстаўрацыі, на якую дзяржава выдаткавала немалую капейку, паўстала пытанне і пра самаакупнасць, да чаго праз тры гады калектыў пакрысе якраз і набліжаецца. Што гэта азначае? Тое, што калі бюджэт дае 100 працэнтаў фінансаў, то да іх дадаецца і яшчэ 70 працэнтаў уласных заробкаў. Адкуль? Напрыклад, толькі сувенірная крама за 7 месяцаў года зарабіла мільярд рублёў! А тысячы турыстаў? І да гэтых паказчыкаў музей-запаведнік рухаўся па ўласнай ініцыятыве. Калі казаць дакладна — па ініцыятыве кіраўніка. Дарэчы, і гэтыя паказчыкі — на ўзроўні буйнейшых музеяў свету.

## У ЗАМКУ БУДЗЕ СВАЁ ВІНО?

Вядома, сітуацыя з вытворчасцю нацыянальных сувеніраў у нас вымушае жадаць лепшага, але вось сёння сюды, у Нясвіж, ідуць больш за тысячу найменняў сувеніраў і рознага кшталту падарункаў ад 76 пастаўшчыкоў, як дзяржаўных, так і ад прыватнікаў, у асноўным айчынных. Прычым купляецца музеем не столькі тое, што прапануецца, а тое, што эксклюзіўна замаўляецца: і «фірменная» друкаваная прадукцыя, і кераміка, і шкло, і саломка. Напрыклад, шакалад «Чорная панна Нясвіжа», які набыць можна выключна ў гэтым горадзе. А яшчэ нядаўна быў зарэгістраваны таварны знак «Пане Каханку», таму неўзабаве можа з'явіцца ў Нясвіжскім замку і эксклюзіўнае віно. Сяргей Клімаў гарантуе, што і гэты тавар уганаруе толькі паліцы замкавай крамы.

## ДОБРЫ ПРЫКЛАД КІРАЎНІКА

Як гаворыцца, чым далей у лес — тым болей дроў. Незаўважна, паціху ўкамплектаваўся штат установы, а ў ім пераважна людзі маладыя: гісторыкі, археолагі, архівісты (дарэчы, плануецца рэгулярнае выданне музейнага навуковага зборніка). І тут новыя клопаты для горада і комплексу: людзям жа недзе трэба жыць, таму раён ужо выдзеліў пляц пад 12-кватэрны дом, дапамагае з арэндным жыллём. Дарэчы, пакуль наваселля работнікі запаведніка не святкавалі. Не мае ўласнага жылля і сам кіраўнік.

І яшчэ адзін разлік Сяргея Клімава. Як вядома, найбольшы наплыў турыстаў адбываецца ў выхадныя. У суботу, напрыклад, прыязджаюць аўтобусы з Расіі, Прыбалтыкі, Польшчы, Украіны. Людзі цешацца экскурсіямі, а ў нядзелю можна дадому выбірацца. І справа не толькі ў тым, што за дзень можна адведаць усе нясвіжскія славутасці, але і ў тым, дзе можна пераначаваць, дзе можна правесці вечар, асабліва моладзі... Але ўсё гэта вырашыцца. Бо істотнае тое, што культурныя справы вырашаюцца разам з эканамічнымі. Памятаеце ж прымаўку: «Не маеш грошай — няма чаго будавацца». А паколькі будуюцца людзі — значыць, ёсць у іх магчымасці.

**Пятро РАМАНЧУК**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Гасцёўня

**Цярэнцій ЛУЦЭВІЧ:**

# «З ДЗЯЦІНСТВА ЎСЕ ЗАВУЦЬ МЯНЕ ПРОСТА ЦІРЫ»



**Высокі, ладны мулат Цярэнцій Луцэвіч на футбольным полі вылучаецца адразу. Ёсць у яго гульні і рухах нейкая надзвычайная натуральнасць. Спартыўную кар'еру хлопец пачынаў у футбольным клубе «Мінск», потым гуляў у дублі мінскага «Дынама», а зараз праводзіць першы поўны сезон у складзе «Гомеля». Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з 22-гадовым футбалістам, каб даведацца пра тое, што ўдзел у фотасесіі не азначае старт мадэльнай кар'еры, а медыйнасць неабавязкова мае на ўвазе ўпэўненасць у сабе.**

## МАЛАДЫ «ГОМЕЛЬ»

**— «Гомель» прыкладна на 2/3 укамплектаваны маладымі гульцамі. На твой погляд, гэта плюс ці мінус?**

— Ведаеце, я не адчуваю перавагі ў адзін ці другі бок. У камандзе хапае і сталых спартсменаў. Мне здаецца, у нас добры баланс маладосці і вопыту.

**— А табе з кім лягчэй будаваць стасункі — з аднагодкамі ці з дарослымі калегамі?**

— З усімі хлопцамі з каманды ў мяне працоўныя адносіны. Вядома, з равеснікамі заўсёды камфортна, але, калі ў людзей агульныя інтарэсы, узрост не мае ніякага значэння.

**— Што можаш сказаць наконт Аляксея Мяркулава? Ён жорсткі трэнер?**

— У меру. Прынамсі, калі крытыкуе, не крычыць, тлумачыць усё спакойна, без лішніх эмоцый. Мяркулаў шмат увагі надае прагляду запісаў матчаў, «разбору палётаў». Гэта вялікі плюс у плане пабудовы стратэгіі на гульню.

## БАСЕЙН, КАТОК ЦІ ФУТБОЛЬНАЕ ПОЛЕ?

**— У дзяцінстве ты займаўся футболам, хакеем, плаваннем. Хто накіроўваў цябе ў спартыўнае рэчышча?**

— Бабуля. Побач з домам у нас стадыён, і з ранніх гадоў я прывык бавіць там час. Потым бабуля адвяла мяне ў спартыўную школу «Змена», дзе пачаў займацца футболам. А на плаванне пайшоў, каб элементарна навучыцца трымацца на вадзе. Што ні кажы, а хлопец павінен умець плаваць.

**— Навучыўся?**

— Безумоўна (*усміхаецца*).

**— А чаму не працягнуў займацца на больш сур'ёзным узроўні?**

— Гэта не ўваходзіла ў мае планы. На той момант я ўжо дакладна вызначыўся: хачу быць футбалістам. Усім астатнім займаўся, як кажуць, для сябе. Энергіі было шмат, хапала і на футбол, і на плаванне, і на хакей.

**— З футболам і плаваннем усё зразумела. А як у тваім жыцці з'явіліся канькі і клюшка?**

— Зімой на нашым стадыёне залівалі каток. Я там кожны дзень прападаў. Аднойчы прыйшла жанчына і запрасіла нашу дваровую каманду на дзіцячы аматарскі турнір «Залатая шайба», у якім я і ўдзельнічаў, пакуль праходзіў па ўзросце. Гады тры, напэўна. Аднойчы перамаглі на гарадскім узроўні, трапілі на «рэспубліку», дзе занялі трэцяе месца. Пазней ездзіў у складзе іншай каманды, адстойваў гонар горада — выйгралі «золата».

**— Даўно ўставаў на канькі ці браў у рукі клюшку?**

— Мінулай зімой хадзіў на каток, проста пакатацца. А вось у хакей не гуляў даўно, напэўна, з тых самых часоў (задуменна). Мабыць, адзін раз калі і выходзіў «на каробку»... Ведаеце, дзеці ўжо не тыя: зімой у двары пуста, ніхто не ганяе на каньках, не лепіць снегавікоў і не гуляе ў снежкі. Гэта сумна, насамрэч.

**У адносінах для мяне галоўнае адданасць і давер. Здрадніцтва я не гатовы дараваць ні пры якіх абставінах.**



З любімай бабуляй.

**— Памятаеш той момант, калі асэнсаваў, што хочаш быць футбалістам?**

— Адразу! У сем гадоў і зразумеў, што хачу займацца толькі футболам. Іншая справа, што не ўсім дадзена. Што атрымаецца ў мяне? Паглядзім.

## ШКОЛЬНАЯ ПАРА

**— З якімі пачуццямі ўспамінаеш школьныя гады?**

— З найлепшымі. Школа — гэта як дзяцінства. Гульні, сябры і трошкі ўрокаў (*усміхаецца*). Дарэчы, класа да дзявятага па вучобе ў мяне зусім не было праблем. А потым з-за спаборніцтваў пачаў шмат прапускаць. Асабліва ў выпускным класе было цяжка: падрыхтоўка да паступлення, рэпетытары, футбол...

**— З якімі прадметамі спраўляўся лепш — гуманітарнымі ці тэхнічнымі?**

— Я вучыўся ў лінгвістычнай спецшколе, так што адказ відавочны. Хаця ад матэматыкі не пакутаваў. Фізіка і хімія — іншая справа. Праўда, калі матэматыка атрымлівалася, фізікі і хіміі яшчэ не было (*смяецца*). Класа з дзявятага і з ёй пачаліся праблемы.

**— Тым не менш ты паступіў на эканамічны факультэт БДУ...**

— Трэба было рабіць выбар — спецыяльнасць, на якую трэба здаваць матэматыку ці фізіку-хімію. Свядома адмовіўся ад варыянта з універсітэтам фізкультуры, бо тады я разважаў так: калі што здарыцца (траўма ці нешта іншае) — у мяне павінен быць выратавальны круг.

**— Атрымліваецца ў поўнай меры адчуць, што такое студэнцкае жыццё — лекцыі, сесіі... пераздачы?**

— Асабліва апошняе (*смяецца*). Вядома, мала што паспяваю, збіраюцца «хвасты»... А як па-іншаму? Летам — чэмпіянат, зімой — зборы. Сесіі праходзяць міма. Спадзяюся, што ў гэтым годзе я нарэшце скончу ўніверсітэт.

## «СЯМ'Я — ГЭТА ВЯЛІКАЯ АДКАЗНАСЦЬ»

**— У пачатку года ты змяніў імя і прозвішча, атрымаў новы пашпарт. Тваё жыццё пасля гэтага неяк змянілася?**

— Абсалютна не. Цярэнцій — маё імя пры хрышчэнні. З дзяцінства мяне скарочана называюць Ціры. Проста так склалася, што, калі маці прывезла мяне з Камеруна ў Беларусь, на руках быў толькі адзін дакумент — пасведчанне аб нараджэнні, дзе было запісана маё імя па бацьку. Хаця, калі паглыбляцца, Вобга Цьенчэн — гэта не імя і прозвішча. Вобга — гэта частка доўгага афрыканскага прозвішча. Карацей кажучы, усё было занадта складана і заблытана. Я даўно збіраўся афіцыйна змяніць імя і ўзяць бабуліна прозвішча. Рады, што нарэшце зрабіў гэта.

**— Зараз твая сям'я — гэта хто?**

— Бабуля (*здзіўлена*).

**— Браты, сёстры, цёткі, дзядзькі?**

— Ёсць дзве сястры. Але ў нас з імі вялікая розніца ва ўзросце — больш за 10 гадоў. І так склалася, што бачыў я іх толькі два разы ў жыцці. Адна жыве ў ЗША, другая — у Францыі. Упершыню мы сустрэліся, калі мне ўжо было гадоў 15 ці 16. Зараз я ведаю, што ў мяне ёсць старэйшыя сёстры, люблю іх, чакаю ў госці, але паміж намі няма нейкай цеснай сувязі. У любым выпадку я ўдзячны лёсу, што яны знайшліся, і зараз мы падтрымліваем стасункі. Нядаўна адна з сясцёр прылятала ў госці са сваёй сям'ёй, мы выдатна пабавілі час.

**— А сваю сям'ю калі плануеш завесці — калі табе будзе за трыццаць ці крыху раней?**

— Хіба такое можна прадбачыць? Зразумела, мне б хацелася абзавесціся сям'ёй у маладым узросце. Але гаворка ж ідзе не пра сабаку ці ката. Сям'я — гэта вялікая адказнасць. Трэба спачатку стварыць пэўны базіс, каб забяспечыць сваёй жонцы і будучым дзецям бясхмарнае жыццё. Так што ў мяне ёсць яшчэ час, канкрэтных тэрмінаў я сабе не вызначаю.

**— Якую дзяўчыну бачыш у ролі сваёй будучай жонкі?**

— Добрую (*смяецца*). У адносінах для мяне галоўнае адданасць і давер. Здрадніцтва я не гатовы дараваць ні пры якіх абставінах.

## ЗНАЁМСТВЫ, МЕДЫЙНАСЦЬ І МАДЭЛЬНЫ БІЗНЕС

**— Дзе часцей за ўсё знаёмішся з дзяўчатамі?**

— На вуліцы, у інтэрнэце, ва ўніверсітэце, у агульных кампаніях сяброў...

**— Для цябе гэта не праблема?**

— Насамрэч, наадварот. Мне здаецца, я празмерна сціплы і дзесьці нават нясмелы. У стасунках з супрацьлеглым полам гэта часам перашкаджае.

**— Футбалісты ж самыя медыйныя спартсмены! Хіба гэта не дапамагае адчуваць сябе больш упэўнена?**

— У Беларусі навідавоку дзясятак-другі футбалістаў, якія прывыклі да ўсіх атрыбутаў «зорнасці». Астатнія — звычайныя хлопцы. Я, напрыклад, зусім не люблю распавядаць пра сябе. Асабліва калі для гэтага няма ніякіх падстаў. Вось калі даб'юся чагосьці ў футболе, тады ўвага да маёй персоны будзе апраўданай. Любая іншая папулярнасць мне не патрэбна.

**— Як у выпадку з нашумелай фотасесіяй?**

— Дарэчы, не разумею, чаму гэтая гісторыя прыцягнула столькі ўвагі! Сябар збіраўся адкрываць мадэльнае агенцтва і для «раскруткі» ў інтэрнэце папрасіў паўдзельнічаць у фотасесіі. Для мяне не праблема пакруціцца перад камерай, пагадзіўся. Потым гэтыя фоткі ўсплылі ў інтэрнэце. І многія чамусьці адразу запісалі мяне ў мадэлі. Ды якая з мяне мадэль?

**— Чаму не? Экзатычная знешнасць, спартыўная фігура — прамая дарога ў мадэльны бізнес.**

— Ніколі сур'ёзна не разглядаў гэты варыянт. Тая фотасесія была аднаразовай акцыяй.

## ПАСТАЛЕЎШЫ ЦІРЫ

**— Сочыш за модай?**

— У меру. Насамрэч, тое, што ўсе футбалісты стылягі, — гэта стэрэатып. Хтосьці любіць вылучацца сваёй знешнасцю, хтосьці — не. Раней я насіў прычоску «афра», заплятаў касічкі, выбіраў у адзенні яркія і нават кіслотныя колеры, а зараз, напэўна, пасталеў: коротка пастрыгся, стаў аддаваць перавагу прыглушаным адценням.

**— Шопінг любіш?**

— Так. Я не з тых хлопцаў, якія цураюцца буцікаў (*усміхаецца*).

**— Чым займаешся ў свабодны час?**

— Ды ўсё звычайна... Сустракаемся з сябрамі, ходзім у кіно, кавярні. У мяне шмат сяброў з футбольнай тусоўкі, але ёсць і тыя, хто са мной з дзяцінства. Напрыклад, падтрымліваю адносіны з аднакласніцай. Некаторыя дзяўчаты — выдатныя сябры.

**— Пытанне напрыканцы: самы лепшы футбаліст?**

— З дзяцінства захапляўся Цьеры Анры, сачыў за яго выступленнямі ў «Арсенале». У мяне нават футболка была з надпісам «Анры». Ганяў у ёй па двары.

**— У вас і імёны падобныя — Ціры...Цьеры...**

— Прыемнае супадзенне (*усміхаецца*).

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**
**Фота Дар'і БУРАКІНАЙ.**

**БЛІЦ:**

Сава ці жаваранак? — **Жаваранак.**
Кава ці гарбата? — **Гарбата.**
Салодкае ці салёнае? — **Салодкае.**
Веласіпед ці ролікавыя канькі? — **Веласіпед.**
Аптыміст ці песіміст? — **Аптыміст.**
Рамантык ці рэаліст? — **Рамантык.**
Любімы напой — **Кока-кола.**
Любімая страва — **Бабуліны сырнікі.**
Любімы фільм — **«Кодэкс злодзея», «Ілюзія падману», дэтэктывы.**
Любімая музыка — **Слухаю ўсё, акрамя хард-рока.**
Любімая пара года — **Лета.**
Любімы колер — **Салатавы.**

■ Зіма блізка!

# Сталічныя вуліцы... «падсалодзяць»?

**Пра гэта расказаў журналістам падчас прэс-канферэнцыі начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Дзмітрый Янчык.**

— Адзін з адходаў цукровай прамысловасці — меласа — можа дабаўляцца ў соль, якой пасыпаюць дарогі. Сумесь мае жоўта-карычневы колер. Меласа нейтралізуе шкоднае ўздзеянне солі на метал і абутак. Гэтае новаўвядзенне пакуль у стадыі эксперыменту, які здзейсняць сумесна з Акадэміяй навук, — адзначыў Дзмітрый Янчык.

Пасля збору ўраджаю цукровых буракоў, калі іх перапрацуюць і атрымаюць меласу, пачнецца вытворчасць «мадыфікаванай» солі. Працаваць з «падсалоджанай» сумессю гэтай зімой будуць толькі ў сталіцы — на дваровых тэрыторыях. Не выключана, што пасля падвядзення вынікаў эксперыменту такой сумессю для пасыпкі вуліц у Беларусі пачнуць карыстацца масава.

— Цэнтральныя вуліцы і праспекты сёлета будзем пасыпаць соллю, як заўжды і рабілі. У спальных раёнах звычайна карыстаемся пясчана-салявой сумессю, — зазначыў генеральны дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства абслугоўвання «Гаррэмаўтадар» Мінгарвыканкама Дзяніс Глінскі. — Пакуль што выкарыстанне солі для барацьбы са слізкімі вуліцамі — самы танны і самы эфектыўны метад.

Як запэўніў Дзяніс Глінскі, усё неабходнае для пасыпкі вуліц ужо закуплена, а тэхніка для прыбірання вуліц ад снегу адрамантавана прыкладна на 95 працэнтаў. Для складзіравання снегу па ранейшаму ў ваколіцах Мінска існуе 14 месцаў.

Рыхтуюцца да зімы не толькі гарадскія службы, але і самі мінчане. Па інфармацыі намесніка генеральнага дырэктара Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Галіны Гілевіч, заключаць дагаворы з аўтаўладальнікамі на прыбіранне вуліц ад снегу пачалі яшчэ летам. Больш за 600 гаспадароў машын такія дакументы ўжо падпісалі. Паслуга каштуе пакуль што 21,4 тысячы рублёў. Да зімы, верагодна, гэтая лічба зменіцца, бо зменяцца выдаткі.

А пакуль час снегу яшчэ не прыйшоў, у Мінску збіраюцца павялічыць плошчы зялёных насаджэнняў.

— У бліжэйшы час супрацоўнікі «Мінскзеленбуда» высадзяць каля 7 тысяч дрэў і 31 тысячы хмызнякоў і адновяць прыкладна 7 гектараў газонаў, — расказаў генеральны дырэктар унітарнага прадпрыемства «Мінскзеленбуд» Ігар Кушнярэвіч.

Пачатак работ па пасадцы дрэў і хмызнякоў пачнецца пасля 15 кастрычніка. Акурат да гэтага часу лісце павінна поўнасцю апасці з галін, а гэта значыць, што саджанцы акажуцца больш адаптаванымі для перасадкі. У пітомніку «Мінскзеленбуда» для рэалізацыі падрыхтавана больш за 25 тысяч саджанцаў дрэў і 90 тысяч саджанцаў хмызнякоў. Той пасадачны матэрыял, які не выкарыстае ў працы «Мінскзеленбуд», будзе рэалізаваны насельніцтву. Цэны на саджанцы дрэў пачынаюцца ад 50 тысяч рублёў.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■ Як нас дураць

# НІ ГРОШАЙ, НІ АЎТО...

## Жыхар Кобрына пераслаў $ 13,5 тыс. віртуальнаму ашуканцу

Аб'яву аб продажы аўтамабіля «Фольксваген Пасат» 2009 года выпуску жыхар Кобрына прачытаў на адным з беларускіх аўтамабільных сайтаў. Занадта нізкая цана для аўто, якое знаходзілася, па словах віртуальнага прадаўца, у ідэальным стане, зусім не збянтэжыла патэнцыйнага пакупніка. Гаспадар «Фольксвагена» ў электроннай перапісцы паведаміў, што жыве ў Амерыцы, але яго аўтамабіль знаходзіцца ў Мінску, набыў ён яго падчас вучобы ў мінскай ВНУ. Махляр нават не абцяжарыў сябе тым, каб даведацца, якія навучальныя ўстановы існуюць у беларускай сталіцы (назваў сябе выпускніком Інстытута нафты і газу). Маўляў, пасля атрымання дыплома паехаў у Амерыку, а набыты аўтамабіль пакінуў у гаражы ў Мінску. Праўда, паказаць «Фольксваген» ніхто не можа, паколькі кантактаў у беларускай сталіцы ў гаспадара не засталося. Віртуальны прадавец прапанаваў наступны варыянт: пакупнік адпраўляе $13,5 тыс. праз аплатную сістэму Western Union на імя гаспадара машыны. Копіі квітанцый з закрытым унікальным кодам высылае па электроннай пошце. Пасля гэтага прадавец бярэ білет да Беларусі і ўзамен кода аддае ключы ад аўтамабіля.

Жыхар райцэнтра высветліў у банку, што, сапраўды, без кода грошы нельга зняць, і адразу ж адправіў усю суму. Але ашуканцу гэтага аказалася мала. У чарговым лісце ён папрасіў яшчэ $3,5 тыс., паведаміўшы, што ў яго ёсць кліент, які гатовы заплаціць за практычна новае аўто такую суму.

Пакупнік, западозрыўшы нядобрае, адправіўся ў банк, каб вярнуць свае грошы. Але мужчыну паведамілі, што іх ужо забраў атрымальнік на іншым кантыненце.

«Такое магчыма і без унікальнага кода, — сказаў **начальнік аддзела па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій УУС, падпалкоўнік міліцыі Андрэй ГАЛОДКА.** — У Беларусі да пытанняў атрымання міжнародных грашовых пераводаў ставяцца вельмі сур'ёзна, і без кода грошы ў банку не атрымаеш. У многіх замежных краінах практыкуецца выдаваць грашовы перавод па копіі квітанцыі. З такімі выпадкамі мы сутыкаліся неаднойчы».

Начальнік аддзела паведаміў, што апошнім часам пачасціліся выпадкі інтэрнэт-махлярстваў, звязаных з продажам аўтамабіляў. Так, у органы ўнутраных спраў звярнуліся двое жыхароў Баранавічаў. Адзін адправіў перадаплату за аўто ў памеры $5 тыс., другі — $4 тыс. Ні сваіх грошай, ні машын яны не ўбачылі.

Андрэй Галодка падкрэсліў, што раскрыць такое злачынства і вярнуць грошы пацярпелым вельмі складана, бо махляр знаходзіцца ў іншай дзяржаве. Таму лепш не ўкладваць свае зберажэнні ў заведама ненадзейныя пакупкі.

**БЕЛТА**

■ Спорт-тайм

# ПЯЦЬ ТРАПНЫХ КІДКОЎ...

**...дазволілі мінскаму «Дынама» атрымаць хатнюю перамогу над ханты-мансійскай «Югрой».**

Сталічная каманда даволі ўпэўнена правяла матч і, па вялікім рахунку, не дазваляла апаненту наблізіцца да сябе ў закінутых шайбах. Толькі напрыканцы сустрэчы мінчане крыху паказыталі нервы балельшчыкам, калі Велі-Маці Савінайнен зрабіў лік на табло 5:3. Але «зубры» датрывалі да фінальнай сірэны і запісалі на свой рахунак трэцюю перамогу ў сёлетнім розыгрышы КХЛ. Шайбы за «Дынама» закідвалі Аляксей Калюжны, Лукаш Крайчэк, Томаш Суровы і Джэф Плат, які двойчы перайграў галкіпера «Югры». «Упершыню ў гэтым сезоне мы закінулі больш чым 2 шайбы, — каментуе вынік сустрэчы **Аляксандр АНДРЫЕЎСКІ, галоўны трэнер «Дынама»**. — Адзначыліся пяць разоў і былі абавязаны давесці матч да перамогі. Калі лік стаў 5:1, у саперніка з'явіліся зручныя моманты. Два яны рэалізавалі».

Сёння дынамаўцы на «Мінск-Арэне» прымуць омскі «Авангард». Пачатак гульні ў 19:00.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

# ДРУЖНЫ НЯМЕЦКІ САЮЗ

**Другі тур групавога этапу футбольнай Лігі чэмпіёнаў не прынёс нечаканых вынікаў.**

«Барселона», нягледзячы на адсутнасць у складзе каманды чатырохразовага ўладальніка «Залатога мяча» Ліянеля Месі, пакідае Глазга з трыма ачкамі. Гол у вароты «Сэлтыка» забіў паўабаронца Сеск Фабрэгас. Другі іспанскі клуб «Рэал» (Мадрыд) атрымаў яшчэ больш упэўненую перамогу: чатыры разы залятаў мяч у вароты «Капенгагена». Дублямі адзначыліся Крыштыяну Раналду і Анхель Ды Марыя. Убаку не застаўся і мадрыдскі «Атлетыка», які з лікам 2:1 абыграў «Порту». За чатыры хвіліны да заканчэння асноўнага часу вырашальны гол забіў турэцкі паўабаронца Туран Арда. Трохі не пашанцавала трыўмфатару кваліфікацыйнага адбору «Рэалу Сасьедад». На апошняй хвіліне вароты іспанскага клуба паразіў паўабаронца нямецкага «Баера» Енс Хегелер — 2:1. Дарэчы, апошні раз каманда з басконскага горада Сан-Себасцьян удзельнічаў у «Лізе чэмпіёнаў» якраз 10 гадоў таму!

Пераможца апошняга розыгрышу «Лігі чэмпіёнаў» нямецкая «Баварыя» лёгка разабралася з «Манчэстэр-Сіці» — 3:1. Тры ачкі на свой рахунак запісала і дортмундская «Барусія», разграміўшы «Марсель» — 3:0. Дублем у гэтым матчы вылучыўся лепшы гулец бундэслігі мінулага года Роберт Левандоўскі. Другую перамогу атрымаў «Шальке-04», з лікам 1:0 перайграўшы швейцарскі «Базель». Зараз нямецкі кваліфаер узначальвае групу Е.

Перамогу святкавалі «Арсенал» і «Чэлсі», якія з сухім лікам перайгралі «Напалі» (2:0) і «Сцяўа» (4:0) адпаведна. А вось пераможца англійскага чэмпіянату «Манчэстэр Юнайтэд» не выканаў «праграму максімум», унічыю згуляўшы з данецкім «Шахцёрам» — 1:1. З такім жа вынікам скончылася і сустрэча «Мілана» з «Аяксам», у якой абодва галы былі забіты на апошняй хвіліне матча. «Ювентус», у саперніку якому дастаўся турэцкі «Галатасарай», таксама задаволіўся толькі нічыёй — 2:2.

Між іншым, адзіным хет-трыкам у другім раўндзе адзначыўся форвард «Алімпіякоса» Костас Мітраглу. Ад грэкаў пацярпеў бельгійскі «Андэрлехт» — 0:3.

Матчы трэцяга тура групавога этапу адбудуцца 22—23 кастрычніка.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## «КІТАЙСКАЕ ТАНГА» ПА-БЕЛАРУСКУ

**Манеты Нацыянальнага банка Беларусі ўдастоены ўзнагарод сёмага Міжнароднага конкурсу памятных манет «Манетнае сузор'е-2013», паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў галоўнага банка краіны.**

У намінацыі «Сувенірная манета» пераможцам прызнана сярэбраная памятная манета «Год Змяі» серыі «Кітайскі каляндар», а ў намінацыі «Арыгінальная тэхналогія» 3-е месца прысуджана памятнай манеце «Танга» серыі «Магія танца». Абвяшчэнне вынікаў конкурсу і цырымонія ўзнагароджання пераможцаў адбыліся ў канцы верасня ў Маскве. «Спецыялісты банкаў і манетных двароў, мастакі розных краін станоўча ацанілі глыбока прадуманую тэматыку, высокамастацкае выкананне нашых памятных манет, распрацаваных і выраблених з выкарыстаннем самых прагрэсіўных тэхналогій, — адзначаюць у Нацбанку. — Чарговыя ўзнагароды беларускіх памятных манет у міжнародным нумізматычным конкурсе сведчаць аб прызнанні міжнароднай грамадскасцю плённай працы спецыялістаў Нацыянальнага банка».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## АДКРЫВАЕЦЦА ПАЛЯВАННЕ НА ЗАЙЦА

**З першай суботы па апошнюю нядзелю кастрычніка — з 5-га па 27-е — будзе доўжыцца сезон палявання на зайца-беляка і зайца-русака.**

— Здабываць можна жывёлу любога полу і ўзросту. Дазволена паляванне ў светлы час сутак зброевым спосабам з ганчакамі, з выкарыстаннем гладкаствольнай паляўнічай зброі і патронаў са шротам, — паведаміў «Звяздзе» старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Варабей. — Паляўнічыя сабакі-ганчакі павінны мець палявы дыплом па зайцы і (ці) лісе. Дазваляецца таксама бяззброевы спосаб палявання з выкарыстаннем выжлаў і лоўчых птушак.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## У МАСКВЕ І ГАРАЖ — ЖЫЛЛЁ?

**Сёлета ў сталіцы суседняй дзяржавы з'явілася новая тэндэнцыя на рынку эканомжылля: гаражныя кааператывы ператвараюцца ў жылыя кварталы.**

Уладальнікі там здаюць свае боксы, як кватэры, у арэнду іншагароднім. Арэнда такіх дамоў-гаражоў у Маскве каштуе каля 600 долараў у месяц, што значна ніжэй, чым стаўкі найму «звычайных» кватэр. Спецыялісты ў расійскай прэсе адзначаюць, што падобная практыка набывае ў Маскве масавы характар.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ЗАТРЫМАЛІ ЛЖЭРАБОТНІКАЎ ЖЭСа

**У сярэдзіне верасня трое мужчын у форме работнікаў ЖЭСа пад выглядам рамонту водаправода патрапілі ў кватэру мінчаніна.**

Дзе, пагражаючы прадметам, падобным на пісталет, звязалі ахвяру і забралі ў яе каля 7 тысяч долараў, 800 індыйскіх рупій і ювелірныя вырабы — пярсцёнкі з брыльянтамі і залатыя запінкі.

І вось падазроныя ва ўчыненні дзёрзкага разбою былі затрыманы супрацоўнікамі крымінальнага вышуку МУС і ГУУС Мінгарвыканкама. Імі аказаліся трое 28-гадовых жыхароў сталіцы, два з якіх нідзе не працавалі. Цікава, што раней ніхто з кампаніі ніякіх праблем з законам, за выключэннем парушэння правілаў дарожнага руху, не меў. Падчас вобыску ў затрыманых знайшлі ўкрадзеныя каштоўнасці і частку грошай.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## 1288 ЛІТРАЎ АЛКАГОЛЮ ДЛЯ «АСАБІСТАГА КАРЫСТАННЯ»

**Аператыўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Кастрычніцкага РАУС г. Гродна пры падтрымцы калег з Дзяржаўтаінспекцыі прадухілілі абарачэнне партыі кантрафактнага алкаголю ў аб'ёме 1288 літраў.**

Бліжэй да вечара на трасе М6 паблізу вёскі Пясчанка Гродзенскага раёна праваахоўнікі спынілі фуру пад кіраваннем жыхара Салігорска. Груз аказаўся нелегальным — 450 літраў спіртазмяшчальнай вадкасці, 800 літраў каньячнага спірту, а таксама 48 літровых бутэлек віскі і тэкілы, не маркіраваных беларускімі акцызнымі маркамі. Кіроўца блытаўся ў тлумачэнні, дзе набыў кантрафактны алкаголь, але запэўніваў, што ён для... асабістага карыстання.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ШАШКІ

**Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА**



### ВУЧОНЫ І СПАРТСМЕН

Ім з'яўляецца Пётр Матус **(на фота)**. Нядаўна ён адсвяткаваў сваё шасцідзесяцігоддзе. І яму было з чым сустрэць юбілей — як па прафесіі, так і шашачнай кампазіцыі, якой захапляецца з маленства. Мяркуйце самі: намеснік дырэктара Інстытута матэматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. А па шашачнай кампазіцыі ён — майстар спорту, першы чэмпіён Беларусі па ёй у раздзеле задач-100. Іх стваральнікі назвалі свой клуб яго іменем.

Пазнаёмцеся з новай задачай, дасланай ім у рэдакцыю і прысвечанай Барысу Іванову, таксама майстру спорту, аўтару кнігі «Шашачная кампазіцыя: сучасны погляд» (Мінск, Асобны Дах, 2003). Старадаўняя гульня іх зблізіла ў студэнцкія гады:



**Белыя:** 12, 14, 19, 22, 23, 37, 41, 43, 48, 49, 50, дамкі 5, 16, 18 (14). **Чорныя:** 35, 39, 45, дамкі 34, 36, 47 (6). Замкнуць дзве простыя чорных: 31, 38 (47:24:46А) 44, 40, 40#. А(47:20:46) 42, 1, 41, 28, 44#.

### АЎТАРСКІ-19

Конкурс працягвае Дзмітрый Камчыцкі, майстар кампазіцыі з Магілёва. Пашукайце ў яго пазіцыях выйгрыш белых:



№ 19/5. **Белыя:** a5, b4, c3, c5,d4, e5(6). **Чорныя:** a3, a7, b6, c7, e7, h4(6).

№ 19/6. **Белыя:** b4, c3, d2, d4, e3, f4(6). **Чорныя:** b6, c7, d6, f6, f8, h6(6).

№ 19/7. **Белыя:** a5, b6, c5, c7, d6, e5(6). **Чорныя:** a7, b8, d8, g5, h4, h6(6).

№ 19/8. **Белыя:** a5, b6, c5, c7, d6, e5(6). **Чорныя:** a3, a7, b2, b8, e3, g7(6).

Таму, хто з імі справіцца, будуць залічаны і першыя чатыры заданні, якія мы надрукавалі 22 жніўня. Звяртаем увагу, што ў № 3 і № 4 простая чорных h4 знаходзіцца на полі h6.

❑❑❑

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### ПЕРШЫНСТВО БЕЛАРУСІ

13 верасня мы паведамілі аб яго выніках сярод мужчын па шашках-100. Удакладняем, што ў вышэйшай лізе застаўся чэмпіён краіны па шашках-64 Ігар Міхальчанка (Ваўкавыск). Адбылося яно і сярод жанчын. Пераможцамі сталі мінчанкі — міжнародны майстар Вольга Садоўская, міжнародныя гросмайстры Вольга Федаровіч і Ірына Пашкевіч. Месцы ў вышэйшай лізе на будучы год захавалі Святлана Гарбачэнка і Дар'я Федаровіч.

### РАШЭННІ

**«Чацвёрты тур»** (П. Шклудаў): **аўтарскі-17/10** — c3, f6, c1!, c7 (b6) c7, b8 (c5) a7 (d4) cb2! (g3) c3, c3! (gf2) cd4, g1+, **17/11** — c7 (d6 A) b4 (c5 a) d4, e3, a3+. A(b2), e3 (d6), gf2, b4, a1 (d4) b2+. a(d4) gf2, h8 (de3) dc3 (d2) f6/g7, d2 (a3) h8/g7 (b4) f6/g7 (e5) a5 (b2) dc3, b4/d2 (de3) e1+, **17/12** — g5, g3, d8, g5, b4, a3+ і **17/13** — d6, f6, d6, d8, g5, b4, a3+.

■ Рэгіён

## КАЛІ ДАПАМАГАЕ ДЗЯРЖАВА

**У кастрычніку ў кожным раёне Мінშчыны пройдуць урачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя пажылым людзям. У праграме таксама сустрэчы кіраўнікоў раёнаў з прадстаўнікамі ветэранскіх арганізацый, грамадскіх фарміраванняў.**

Усяго ў цэнтральным рэгіёне пражывае звыш 344 тысяч пажылых людзей (24% ад агульнай колькасці насельніцтва). Колькасць асоб, якія «выйшлі» з працаздольнага ўзросту, на Міншчыне, зрэшты, як і ў краіне, пастаянна ўзрастае.

Важнейшая частка дзяржаўнай падтрымкі — пенсіі. Па лініі сацыяльнай абароны іх атрымліваюць больш за 384 тыс. чалавек (29% насельніцтва). Сёння сярэдні памер пенсіі — 2,1 млн рублёў, пенсіі па ўзросце — 2,2 млн рублёў, удзельнікаў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны — адпаведна 3,2 і 3,7 млн рублёў.

Пажылыя грамадзяне карыстаюцца разнастайнымі відамі матэрыяльнай дапамогі. Сёлета бясплатна забяспечаны гароднінай і бульбай 2076 чалавек, 14 тыс. аказана дапамога ў апрацоўцы прысядзібных участкаў, а амаль 12 тыс. — ва ўборцы ўраджаю.

У вобласці працуюць 23 тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. На ўліку ў іх звыш 138 тыс. пажылых і інвалідаў, у тым ліку 24 тыс. абслугоўваюцца на даму. Як паказала практыка, такая форма найбольш прагрэсіўная не толькі з маральна-псіхалагічнага боку, але і ў шмат разоў танней, чым пражыванне ў дамах-інтэрнатах. Акрамя таго, пастаянна развіваюцца і новыя віды паслуг: «санаторый на даму», «патранатная сям'я», дамы сезоннага і дзённага знаходжання, «хуткая сацыяльная дапамога», «інтэрнэт-кафэ», «сацыяльная дача», «сацыяльнае таксі» і іншыя.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** ■

■ Кантакты памежжа

## ДЗЕЛАВЫ ДЫЯЛОГ І... ЧЭРГІ НА МЯЖЫ

**— Ёсць цяжкасці, некаторыя рознагалоссі, але ўсё вырашаем у добрым, дзелавым дыялогу з кіраўніцтвам вобласці і раёна, — зазначыў на пасяджэнні міжнароднага інвестыцыйнага форуму «Гродзеншчына на скрыжаванні межаў» Рымантас ПУРТУЛІС, кіраўнік праектаў групы кампаній ARVI (Літва), якая інвеставала каля 20 мільёнаў еўра ў будаўніцтва комплексу па вытворчасці мяса індычкі ў Лідскім раёне магутнасцю 6 тысяч тон у год.**

Комплекс будзе складацца з фермаў па вырошчванні індычкі, камбікормавай вытворчасці, цэхаў па забоі, перапрацоўцы і фасоўцы мяса. Плануецца стварыць каля 200 новых рабочых месцаў. Акрамя таго, ARVI інвестуе каля 7 мільёнаў еўра ў праект мадэрнізацыі Лідскага ветэрынарна-санітарнага ўтылізацыйнага завода, скіраваны на ўкараненне сучасных тэхналогій утылізацыі адходаў жывёльнага паходжання.

Паводле інфармацыі **пасла Беларусі ў Літве Уладзіміра ДРАЖЫНА**, які ўдзельнічаў у рабоце інвестыцыйнага форуму ў горадзе над Нёманам, менавіта Гродзеншчына сёння з'яўляецца для нашых суседзяў галоўным эканамічным партнёрам. Сёлета ў Літву пастаўляюцца з Прынямоння тавары па 165 пазіцыях, і чакаецца, што аб'ём гадавога экспарту складзе 50 мільёнаў еўра. Прыкладна чвэрць літоўскіх інвестыцый у нашу краіну — у Гродзенскую вобласць. Акрамя вышэйзгаданых, цяпер разглядаюцца ўзаемныя праекты ў дачыненні да прадпрыемстваў «Лідсельмаш» і «Лідаграмаш». Ёсць ужо не проста пратакол намераў, а прапрацоўка пытанняў, звязаных з вытворчасцю прадукцыі і яе рэалізацыяй у краінах Балтыйскага рэгіёна.

На думку Уладзіміра Дражына, у тым, што Гродзеншчына за апошнія гады стала прывабнай для літоўскага бізнесу, вялікая заслуга міжрэгіянальных кантактаў. Заключаны 23 дагаворы паміж рэгіёнамі Літвы і Гродзенскай вобласці. Суседзі супрацоўнічаюць не толькі ў рамках еўрарэгіёна «Нёман», але і ў «Паўночным вектары Гродзеншчыны», які аб'ядноўвае эканамічны патэнцыял Астравецкага, Ашмянскага і Смаргонскага раёнаў. Уладзімір Дражын таксама адзначыў станоўчую дынаміку «беларускага берага» ў літоўскай Клайпедзе. Пасля беларуска-літоўскага эканамічнага форуму ў красавіку кампанія «Беларуськалій» набыла 30% аднаго з галоўных тэрміналаў порта, які займаецца адгрузкай калійных угнаенняў у трэція краіны. Цяпер разглядаецца другі праект — выкуп яшчэ аднаго тэрмінала. Летась у Клайпедзе было перавалена 13,5 мільёна тон беларускіх грузаў. І калі такая дынаміка захаваецца, то ў бліжэйшыя год-два, на думку Уладзіміра Дражына, рэальна выйсці на 15 мільёнаў тон.

Такім чынам, суседзі знаходзяць выгаду са свайго памежнага знаходжання. Праўда, мяжа — гэта і вядомыя праблемы з яе перасячэннем. Пра іх, як падалося, без асаблівай надзеі на нейкую палёгку казаў на інвестыцыйным форуме ў Гродне кіраўнік праектаў групы кампаній ARVI Рымантас Пуртуліс. Літоўскія інвестары цяпер вучаць новым тэхналогіям, што будуць укараняцца на Лідчыне, беларускіх маладых спецыялістаў і пастаянна вымушаны затрачваць шмат часу на перасячэнне мяжы.

А вось асабістыя ўражанні **генеральнага консула Беларусі ў Беластоку Аляксандра БЕРАБЕНІ,** які таксама ўдзельнічаў у форуме «Гродзеншчына на скрыжаванні межаў»:

— Летам я з сям'ёй ехаў у адпачынак з Беластока ў Гродна — не на дыпламатычнай машыне і з дыппашпартам, а на аўтамабілі з беларускімі нумарамі, як звычайныя людзі. Пад'ехалі да пагранперахода: мы былі ў чарзе 123-мі. А праз 2 гадзіны 15 хвілін сталі... 169-мі. Можна ўявіць праблемы тых, каму трэба ўстанавіць нейкія дзелавыя кантакты!..

Такія яны, рэаліі памежнага партнёрства. Тым не менш у рэгіёнах Польшчы ёсць бізнес-структуры, якія зацікаўлены ў супрацоўніцтве з нашай краінай, у тым ліку ў інвестыцыйным плане. І беларускія дыпламаты, зазначыў Аляксандр Берабеня, гатовы аказаць у гэтым любую дапамогу.

**Барыс ПРАКОПЧЫК** ■


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО НА ПРАВЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «ГРОДНЕНСКИЙ ЛИКЕРО-ВОДОЧНЫЙ ЗАВОД»

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Лот № 1 | | | | |
| Наименование предмета торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение с инв. № 621/С-13699** – сливной пункт одноэтажный, кирпичный площадью 110,8 кв.м, 1977 г.п.; **капитальное строение с инв. № 621/С-13750 –** хранилище зерна башенного типа, 1979 г.п., площадью 127, 2 кв.м в составе: 2 хранилища объемом по 1400 куб.м; 3 металлических ворот общей длиной 12,19 м; калитка металлическая; 2 ограждения общей длиной 293,87 м; **капитальное строение с инв. № 621/С-21021 –** цементно-бетонное покрытие площадью 1340 кв.м | | | | |
| Местонахождение имущества | Минская обл., Несвижский р-н, г.п. Городея, ул. Вокзальная, 62 и 62/1 | | | | |
| Информация о земельном участке | Имущество расположено на земельном участке площадью 0,2921 га с кадастровым номером 624255700001001171, назначение – обслуживание зданий и сооружений | | | | |
| Начальная цена предмета торгов, руб. | **859 714 340 рублей с учетом НДС** | Сумма задатка, руб. | **25 791 430 рублей** | Условия торгов | **Без условий** |
| Сведения о продавце | ОАО «Гродненский ликеро-водочный завод», г. Гродно, ул. Виленская, 22, тел. (0152) 77 17 89 | | | | |
| Сведение об организаторе торгов | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел.: (0152) 77 23 79, 74 49 11 | | | | |
| Номер счета организатора торгов для перечисления задатка | р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | Условия оплаты | Определяется по согласованию победителя торгов с продавцом при заключении договора купли-продажи | | |
| **Торги состоятся 5 ноября 2013 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | | | |
| Срок подачи документов для участия в торгах | **по 1 ноября 2013 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | | |

Для участия в торгах необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить организатору следующие документы:
1. заявление;
2. заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка;
3. **юридическим лицам – резидентам РБ –** заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;
**юридическим лицам – нерезидентам РБ –** легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
**индивидуальным предпринимателям –** заверенную копию свидетельства о государственной регистрации;
**представителям юридического лица, индивидуального предпринимателя –** доверенность и заверенные копии документов, удостоверяющего личность представителя;
**физическим лицам –** заверенную копию документа, удостоверяющего личность физического лица;
**представителем физического лица –** нотариально заверенная доверенность и копия документа, удостоверяющего личность представителя;
**иностранным гражданам или лицам без гражданства –** документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и документ, подтверждающий полномочия. После предоставления документов осуществляется предварительная регистрация и заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов.

**Порядок проведения торгов:** Шаг аукциона – 5% от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Задаток, внесенный победителем торгов, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов, продавец вправе снять имущество с торгов до объявления его проданым. Победитель торгов возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов на основании счет-фактуры, выставленной Организатором торгов.

**Подробная информация на сайте www.fincentr.by и по телефонам в г. Гродно: (0152) 77 23 79, 74 49 11.**

И З В Е Щ Е Н И Е О П Р О В Е Д Е Н И И А У К Ц И О Н А

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Базис-Новополоцк» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

**производственно-складской базы,**

**расположенной на земельном участке об. пл. 1,9593 га, по адресу: Витебская область, г. Новополоцк, ул. Нефтепереработчиков, 4,**

в составе: **арочник**, об.пл. **442,8 кв.м.**, инв. № 252/С-10002; **арочник,** об. пл. **529,5 кв.м**, инв. № 252/С-10001; **картофелехранилище**, об. пл. **803,9 кв.м**, инв. № 252/С-1000; **картофелехранилище,** об. пл. **969,3 кв.м**; **картофелехранилище**, об. пл. **1721,7 кв.м**, инв. № 252/С-10303; **склад материальный,** об. пл. **1129,5 кв.м,** инв. № 252/С-12361; **коптильный цех,** об. пл. 322,4 кв.м, инв. № 252/С-12360; **квасильно-засолочный цех**, об. пл. 589,1 кв.м, инв. № 252/С-12359; **весовая**, об. пл. **89,5 кв.м**, инв. № 252/С-12891; **площадка № 1,** об. пл. **6827 кв.м**, инв. № 252/С-18023; **пропускная**, об. пл. **10,2 кв.м**, инв. № 252/С-17888; **линия электропередачи**, инв. № 252/С-18860; **водопровод,** инв. № 252/С-18861; **здание трансформаторной подстанции**, об. пл. 39,2 кв.м; инв. № 252/С-18896, в т.ч. трансформаторы ТМ 160/10, 1975 г.в.; ТСН 160/10, 1966 г.в.; ячейка КСО 366-4н, 1976 г.в. (5 ед.); весы автомобильные (30 тонн). Обременения: частичная аренда.

**Начальная цена с НДС – 4 731 240 000 бел. руб.**

Земельный участок об. пл. 1,9593 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования с ограничениями: охранная зона ЛЭП свыше 1000 В (0,3822 га).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Особые условия: возмещение покупателем затрат, понесенных продавцом по проведению оценки стоимости имущества в сумме – 22 466 361 (в т.ч. НДС) бел. руб.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги. Аукцион состоится **06.11.2013 в 14.00** по адресу: г. Новополоцк, ул. Ктаторова, 21, актовый зал. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.11.2013 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703.

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.**

**ВНИМАНИЮ КРЕДИТОРОВ ОАО «ПромСолИнтер»**

ОАО «ПромСолИнтер» сообщает об уменьшении своего уставного фонда. Новый размер уставного фонда ОАО «ПромСолИнтер» составит 101 760 000 рублей.

За дополнительной информацией и для предъявления требований о досрочном погашении обязательств обращаться по адресу: г. Минск, ул. Орловская, д. 58, оф. 217 и по телефону: (017) 210-19-85. УНП 191836410

УНП 100070331

**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

**по объекту «Многоэтажный жилой дом со встроенными объектами торгово-общественного назначения и многоуровневой гараж-стоянкой № 3 по генплану по пр. Дзержинского в границах пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожной – пер. Разинского – пер. 1-го Извозного» (1-я очередь, без строительства ТП № 40.6 по генплану),**

*опубликованную в газете «Звязда» 17.12.2011 года, газете «Рэспубліка» 25 ноября 2011 года»*

**Застройщик**: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, проспект Победителей, дом 89, корпус 2, помещение 10, каб. 18, 41. **Тел. 8 (017) 216 00 09.**

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются 1-, 2-комнатные квартиры.**

Стоимость 1 кв.м 1-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1 700 (одна тысяча семьсот) долларов США, при 100% единовременной оплате 1 650 (одна тысяча шестьсот пятьдесят) долларов США.

Стоимость 1 кв.м 2-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1 600 (одна тысяча шестьсот) долларов США, при 100% единовременной оплате 1 550 (одна тысяча пятьсот пятьдесят) долларов США.

По соглашению сторон оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка.

**Извещение о проведении 22 октября 2013 года повторного открытого аукциона по продаже находящегося в республиканской собственности и хозяйственном ведении РУП «Белпочта»**

**транспортного средства (почтового вагона)**

**Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности,**

утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609.

**Форма проведения торгов – открытый аукцион на повышение начальной цены.**

| Сведения о продаваемом имуществе: Порядковый номер и наименование предмета торгов (аукциона) | Сведения о продаваемом имуществе: Инвентарный номер по бухг. учету | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Место нахождения предмета торгов (аукциона) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **1. Почтовый вагон № 15457** | 5003003 | 53 068 288 | 5 300 000 | Размещен на подъездных путях ж.д. ст. Гомель территории Гомельского филиала РУП «Белпочта» по адресу: г. Гомель, ул. Курчатова, 2. |

Продавец имущества (организатор аукциона) – Гомельский филиал РУП «Белпочта» 246048, г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. (0232) 79 67 44.

Аукцион проводится **22 октября 2013 г. в 11[00] по адресу: г. Гомель, ул. Курчатова, 2, на 3-м этаже административного корпуса Гомельского филиала РУП «Белпочта», актовый зал.**

Для участия в аукционе необходимо:

**внести задаток (не позднее 17 октября 2013 г.)** в размере, указанном в графе 4;

реквизиты для перечисления задатка:

- **в белорусских рублях** – расчетный счет 3012021020054 в ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Барыкина, 94, МФО 151501664, получатель – Гомельский филиал РУП «Белпочта», УНП 400395996;

представить продавцу (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах);

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**Прием заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов, консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Гомель, ул. Курчатова, 2, 3-й этаж, кабинет «Аренда», с 07.10.2013 г. по 17.10.2013 г. включительно, в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.** Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в торгах.

Продавец (организатор аукциона) имеет право отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения торгов.

Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

В случае, если заявление на участие в аукционе по конкретному предмету торгов подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику (претенденту на покупку) при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (единственный участник торгов) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Победитель торгов (единственный участник торгов) обязан перечислить на текущий (расчетный) банковский счет, сумму затрат на организацию и проведение торгов в течение трех рабочих дней со дня их проведения. Фактические затраты должны быть отражены в смете расходов, утверждаемой организатором торгов до дня проведения торгов.

Договор купли-продажи предмета торгов подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения торгов. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 30 календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

**Контактные телефоны: + 375 (0232)796714, 796744.**

**Официальный сайт продавца (организатора аукциона): www.office@gomel.belpost.by**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНИНУ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

**15.11.2013 г. в 12.00 в здании Сопоцкинского поселкового исполнительного комитета (г.п. Сопоцкин, ул. Гродненская, 6) состоится аукцион по продаже земельного участка в частную собственность гражданину Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома**

| Номер лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, бел. руб. | Инфраструктура и условия инженерного развития земельных участков |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1 | **422076203801000215, Республика Беларусь, Гродненская область, Гродненский район, д. Заречанка, У-45** | 0,1409 | Для строительства и обслуживания жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 11 372 321 | 9 000 000 | Централизованное газоснабжение |

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) со дня опубликования настоящего извещения и до 16.00 6 ноября 2013 г. представляет в комиссию по организации и проведению аукциона по адресу: г.п. Сопоцкин, ул. Гродненская, 6 документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;

копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10% от начальной цены предмета аукциона (1 137 250 белорусских рублей) на расчетный счет № 3600514140172, получатель – Главное управление МФ РБ по Гродненской области Сопоцкинский посисполком, филиал 400 ОУ «АСБ Беларусбанк» г. Гродно, УНН 500027409, код 752, назначение платежа 04901, с отметкой банка о его исполнении;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, документ, удостоверяющий личность;

При подачи документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанный в извещении срок соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в настоящем извещении.

Осмотр земельного участка осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Контактные телефоны: (8-029) 388 39 90, (8-0152) 992 598, (8-0152) 992 354.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на пять процентов, обязан:

в течение 10 рабочих дней со дня принятия утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания его несостоявшимся, внести плату за земельный участок на расчетный счет № 3600514140172, получатель – Главное управление МФ РБ по Гродненской области Сопоцкинский посисполком, филиал 400 ОУ «АСБ Беларусбанк» г. Гродно, УНН 500027409, код 752, назначение платежа 04901, а также возместить затраты на организацию и проведения аукциона, в том числе расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения (суммы, указанные в графе 6, подлежат корректировке исходя из фактических затрат) на расчетный счет № 3600514140172, получатель – Главное управление МФ РБ по Гродненской области Сопоцкинский посисполком, филиал 400 ОУ АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, УНН 500027409, код 752, назначение платежа 04901;

осуществить в двухмесячный срок со дня получения выписки из решения о предоставлении земельного участка победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, государственную регистрацию права на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (г. Гродно, ул. Захарова, 27);

после государственной регистрации права на земельный участок, до начала строительства жилого дома, получить техническую документацию на его строительство;

приступить к занятию земельного участка в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство жилого дома;

снять на земельном участке плодородный слой почвы из-под пятен застройки после получения разрешительной документации на строительство жилого дома и использовать его для благоустройства участка;

шаг аукциона 10% от предыдущей цены, называемой аукционистом.



Фота слова Яўгена ПЯСЕЦКАГА

Незямная пачвара — жалезабетонны дот невядома якой вайны затаіўся пад соснамі каля лясной дарогі. Праз сотню метраў гэтая дарога выбягае на палянку да брамы адроджанага Баркалабаўскага манастыра. Старажылы кажуць, што стары дот ледзь-ледзь здолелі перасунуць далей ад дарогі, дзе ён і застаўся ляжаць дахам уніз, абрастаючы маладымі дрэўцамі. Хто ведае, магчыма, у будучыні пад слоем зямлі яго знойдуць археолагі. Ці зразумеюць нашы далёкія нашчадкі, чаму гэту пачвару адкінулі далей ад дарогі, якая вядзе ў храм?

*Чарада стагоддзяў праміне,*
*Паляціць да зорных карагодаў…*
*Што тады раскажуць пра мяне*
*Археолагі трохтысячнага года?*

*Знойдуць плуг —*
*зазначаць, што араў.*
*Знойдуць шклянку —*
*скажуць, жыў не сумна,*
*А як знойдуць вершы, што пісаў,*
*Можа, скажуць:*
*продак быў разумны.*

*Не уцямяць толькі аднаго:*
*Для каго той дот каля дарогі,*
*На каго я гартаваў лязо,*
*І навошта будаваў астрогі?*

*Вынаходзіў, як хутчэй забіць*
*Ды забыць сваю віну прад Богам…*
*Археолагам няцяжка быць —*
*Цяжка зразумець сябе самога.*






Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Сом. Антылопа. Качан. Яліна. Хром. Трук. Афрыка. Завея. Зебу. Кат. Акт. Букса. Цяга. Арк. Жако. Аск. Нарад. Алока. Радон. Дыпламат. Ажан. Іда. Ікс. Пагорак. Улар. Ротар. Апала. Мол. Агат. Габелен.

**Па вертыкалі:** Зеў. Архар. Рубец. Кара. Пані. Яма. Агарод. Карова. Кар. Кокс. Макі. Клан. Ураза. Антык. Халоп. Чарка. Атам. Ват. Пралог. Тонік. Рала. Зубр. Луг. Жаба. Вектар. Мір. Канада. Месцаход. Таксафон.

■ Запрашальнік

# ДАБРАЧЫННЫ БАЛЬ У ВІЦЕБСКУ

**5 кастрычніка а 18-й гадзіне ў Віцебску ў культурна-гістарычным комплексе «Залатое кола Віцебска «Дзвіна» пройдзе дабрачынны баль у стылі XIX стагоддзя. Усе сродкі ад продажу квіткоў і атрыманыя рэчы (кансервы, корм для жывёл, падсцілкі і г.д.) будуць перададзены гарадскому прытулку для бяздомных жывёл. Квіток на баль каштуе 20 тысяч рублёў.**

Прытулак для бяздомных жывёл Віцебска быў адкрыты 16 жніўня 2011 года і існуе дзякуючы энтузіязму начальніка ўстановы Наталлі Зубавай, супрацоўнікаў прытулку, валанцёраў. Сёння прытулак перажывае не лепшыя часы. Гэта звязана з недастатковым фінансаваннем, з вялікай колькасцю гадаванцаў, з імкненнем гараджан падкінуць прытулку жывёл, а не забраць іх адтуль.

Гэтым балем распачынаецца сезон 2013-2014 гг. у Віцебску, дзе падобныя мерапрыемствы ўжо сталі традыцыйнымі дзякуючы клубу гістарычнай рэканструкцыі «Паўночная вежа» і яго каардынатарам Элі Петрачэнцы і Хрысціне Бондаравай. Баль будзе складацца з двух аддзяленняў: вальсавага і кантраданснага. Прагучаць творы сучасных кампазітараў і аўтараў XIX стагоддзя ў жывым выкананні.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■ А не шкодзь!

## «Арсенал» браканьера: петлі, капканы і... дзіды

**Браканьера-прафесіянала выкрылі дзяржінспектары аховы жывёльнага і расліннага свету ў Бабруйскім раёне.**

— Знаходзячыся ў рэйдзе на тэрыторыі Гарбацэвіцкай паляўнічай дачы паблізу вёскі Мартынаўка, супрацоўнікі Бабруйскай міжрайінспекцыі знайшлі месца незаконнай здабычы лася. Жывёла была задушана стальной пятлёй. Гэта ўказвала на тое, што браканьерства, хутчэй за ўсё, справа рук мясцовага жыхара. Дзяржінспектары выявілі падазронага і атрымалі дазвол на агляд яго дома, — паведамілі ў Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. — Трафеі на падлозе і сценах — шкуры — заўважылі адразу пры ўваходзе. Пры далейшым аглядзе дома і падсобных памяшканняў дзяржінспектары знайшлі і канфіскавалі 56 металічных петляў, 9 апканаў, 2 дзіды для здабычы дзікіх жывёл, шкуры дзіка, казулі, андатры, бабра і зайца — усяго 27 штук, а таксама 40 кілаграмаў свежамарожанага мяса лася. Вядома, што падазроны грамадзянін раней працаваў лесніком, але як паляўнічы ніколі зарэгістраваны не быў.

## Дарагімі атрымаліся дровы...

**Работнікі Навагрудскай міжрайінспекцыі праверылі законнасць высечкі дрэў у прыдарожнай паласе паблізу пасёлка Наваельня Дзятлаўскага раёна.**

— Высветлена, што супрацоўнікі Дзятлаўскага філіяла ДП «Гроднааблпаліва» без лесасечнага білета, іншымі словамі, незаконна, ссеклі 304 дрэвы, — паведамілі ў Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. — Матэрыялы накіраваны ў Дзятлаўскі РАУС для прыняцця рашэння адносна прыцягнення парушальнікаў да крымінальнай адказнасці. Незаконнай высечкай дрэў прыроднаму наваколлю нанесена шкода ў асабліва буйным памеры — 98 мільёнаў рублёў (980 базавых велічынь).

**Сяргей РАСОЛЬКА**

Даты | Падзеі | Людзі

***Дзень пачатку касмічнай эры чалавецтва. Абвешчаны Міжнароднай федэрацыяй астранаўтыкі ў верасні 1967 года.***

***Сусветны дзень жывёл. Адзначаецца па рашэнні Міжнароднага кангрэса прыхільнікаў руху ў абарону прыроды, які праходзіў у 1931 г. у Фларэнцыі.***

**1582** год — у адпаведнасці з указам Папы Рымскага Грыгорыя XIII, у каталіцкіх дзяржавах праведзена рэформа юліянскага календара, быў уведзены новы (грыгарыянскі) каляндар. Разам з іншымі дзяржавамі на гэты каляндар перайшлі і беларускія землі, якія ўваходзілі ў Рэч Паспалітую (Савецкая Расія гэты стыль прыняла 31 студзеня 1918 года).

**1883** год — з Парыжа ўпершыню адправіўся ў шлях кантынентальны цягнік «Усходні экспрэс». Маршрут яго пралягаў праз Страсбург, Вену, Будапешт і заканчваўся ў Бухарэсце. У 1906 годзе, пасля пабудовы знакамітага Сімпланскага тунэля, «Усходні экспрэс» пачаў здзяйсняць паездкі да Стамбула. Са з'яўленнем больш танных авіяліній прыбытак ад экспрэса стаў падаць, і ў 1977 годзе яго абслугоўванне, здавалася б, канчаткова спынілася. Адна дзякуючы прадпрымальніку і энтузіясту чыгунак Джэймсу Шэрвуду легендарны цягнік, праслаўлены ў знакамітым дэтэктыве Агаты Крысці (а таксама ў раманах Грэма Грына «Стамбульскі экспрэс» і Сідні Шэлдана «Калі наступіць заўтра»), набыў другое нараджэнне: 25 мая 1982 года — ужо як «Венецыянскі Усходні экспрэс» — ён пачаў курсіраваць з Лондана ў Венецыю.



**1948** год — 65 гадоў таму нарадзіўся (горад Гродна) Аляксандр Мухтаравіч Байчораў, беларускі філосаф, доктар філасофскіх навук (1986), прафесар (1988). Даследуе праблемы знешняй палітыкі ЗША, еўрапейскай бяспекі і міжнароднага кантролю над узбраеннем.

Было сказана

**Максім БАГДАНОВІЧ, паэт, публіцыст, перакладчык:**

*«Дзіцё, што ў коласе зярно...»*

■ Zамор'е

## У АМЕРЫКУ НА ГАРБУЗАХ?

У лістападзе на паўднёвым усходзе Германіі, паблізу горада Людвігсбурга, адбудзецца традыцыйнае свята збору ўраджаю гарбузоў. Дасягненні нямецкіх фермераў вартыя захаплення: плады нярэдка важаць больш за 200 кг, а рэкорд свята наогул фантастычны — 635 кг!

У гэтыя дні ў старажытным рэстаране XVII стагоддзя можна пакаштаваць мноства страў, прыгатаваных з тых самых гарбузоў: гасцям падаюць запяканкі, пірагі, пюрэ, супы і нават пельмені. Але ўпрыгажэннем праграмы з'яўляецца гарбузовая рэгата. У гэтым адметным спаборніцтве ўдзельнічаюць толькі «судны», выраблены з гарбуза. Тэхналогія нескладаная: ад гародніны пакідаюць толькі абалонку з адтулінай для размяшчэння адважнага капітана. А вось кіраваць такім «караблём» вельмі няпроста. Гарбуз паводзіць сябе капрызна, збіваецца з курсу і раз-пораз спрабуе перакуліцца. Таму заплыў патрабуе ад удзельнікаў вялікага майстэрства і спрыту.



Адчайныя намаганні спартсменаў выклікаюць захапленне ў публікі. Далёка не ўсім удаецца дасягнуць фінішу, а некаторых даводзіцца нават выратоўваць. Але самыя ўдачлівыя, хто скарыў дыстанцыю, робяцца героямі свята. Адзін з пераможцаў спаборніцтваў мінулых гадоў, Мануэль Мемерт, падзяліўся сакрэтам поспеху: «Каб перамагчы, трэба самому «стаць гарбузом». Апошнія тры ці чатыры тыдні я еў толькі стравы з гарбуза: суп, катлеты і г. д.».

Дарэчы, нямецкія гісторыкі мяркуюць, што старажытныя германцы на гарбузовых караблях цалкам маглі дасягнуць Амерыкі нават раней за вікінгаў. Пацвердзіць або абвергнуць гэтую тэорыю можна толькі эксперыментальна. Магчыма, пасля чарговага свята нейкі смяльчак рызыкне-такі скарыць Атлантыку ў гарбузе.

## ПАЛЯКІ — САМЫЯ КАНТАКТНЫЯ АВІЯПАСАЖЫРЫ

Авіякампанія British Airways правяла апытанне сярод 2000 еўрапейцаў, плануючы высветліць, як паводзяць сябе пасажыры рэйсаў на кароткія дыстанцыі. Як аказалася, у выпадку непрацяглага палёту для турыстаў вялікае значэнне маюць зручныя ўмовы і бесканфліктныя суседзі.

Большасць рэспандэнтаў заявіла аб тым, што іх раздражняюць шумныя спадарожнікі, у тым ліку дзеці. Яшчэ адной прычынай для засмучэння з'яўляецца ежа і напоі, якія трэба аплачваць на борце. Цэны, як правіла, завышаныя, а смак прадуктаў не заўжды адпавядае чаканням. У выніку 27% бельгійцаў, 37% галандцаў і 18% французаў бяруць у дарогу свае бутэрброды. А на пытанне, што магло б зрабіць палёт больш прыемным, 65% рэспандэнтаў назвалі доступ у інтэрнэт, а 25% аддалі перавагу мабільнаму тэлефону, пры тым, што размовы па тэлефоне раздражняюць іншых пасажыраў. Сярод любімых заняткаў на борце еўрапейцы назвалі гутарку з суседзямі. Найменш камунікабельнымі аказаліся бельгійцы — толькі 18% з іх заводзяць размовы з незнаёмымі суседзямі па самалёце, а 82% з большай ахвотай будуць чытаць. Самымі ж схільнымі да кантактаў з іншымі пасажырамі сталі палякі: 37% турыстаў з гэтай краіны стараюцца разгаварыць свайго суседа падчас пералёту.

## МІНІСТЭРСТВА АБАРОНЫ ЗША ВЕРЫЦЬ У «ЛЮДЗЕЙ Х»



Пакаленне генетычна мадыфікаваных «Людзей Ікс» можа з'явіцца ўжо да 2045 года. Прынамсі, менавіта так заявіла Міністэрства абароны ЗША на двухдзённым саміце мінулым летам.

Дасягненні ў галіне генетыкі могуць даць людзям здольнасці мутантаў, нават такіх, як героі вядомых коміксаў Расамаха, Цыклоп ці Навальніца. Аднак у міністэрстве таксама ўзгадалі, што з-за «генетычнай няроўнасці» звышздольнасці будуць даступныя не ўсім, бо многія людзі проста не змогуць скарыстацца навуковымі дасягненнямі.

«X—Men» — гэта каманда супергерояў, створаная пісьменнікам Стэнам Лі і мастаком Джэкам Кірбі. Упершыню комікс пра звышлюдзей быў выдадзены кампаніяй Marvel 50 гадоў таму, у 1963-м. Мутанты выкарыстоўвалі свае магчымасці для дабра і росквіту чалавецтва, нягледзячы на варожае стаўленне да іх звычайных людзей. У апошнія 10 гадоў коміксы былі паспяхова перанесены на вялікі экран, і гэтыя фільмы набылі вялікую папулярнасць ва ўсім свеце.

## ШКАРПЭТКІ 25-ГАДОВАЙ ВЫТРЫМКІ

Брытанец Фрэнк Тэрнбрыдж абвясціў, што з'яўляецца шчаслівым уладальнікам самых трывалых шкарпэтак у свеце. 65-гадовы мужчына набыў гэтую пару чвэрць стагоддзя таму і з таго часу не можа на яе нарадавацца.



Паводле слоў Тэрнбрыджа, ён надзявае гэту пару штотыднёва, але за ўвесь тэрмін носкі на шкарпэтках, выраблены з нейлону і шэрсці, не з'явілася ніводнай дзірачкі. Цікава, што 25 гадоў таму брытанец набыў дзве пары, але адна з іх хутка стала непрыдатнай для карыстання. «Мая жонка мые іх кожны тыдзень, бо я нашу гэтыя шкарпэткі пастаянна, зімой і летам: яны вельмі зручныя», — з гонарам заўважае Тэрнбрыдж. Фрэнк працуе следапытам, вывучаючы шляхі міграцыі пантэр і іншых буйных драпежнікаў сямейства каціных па ўсім свеце.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.17 | 18.38 | 11.21 |
| Віцебск — | 7.07 | 18.27 | 11.20 |
| Магілёў — | 7.07 | 18.28 | 11.21 |
| Гомель — | 7.02 | 18.26 | 11.24 |
| Гродна — | 7.32 | 18.54 | 11.22 |
| Брэст — | 7.32 | 18.56 | 11.24 |

## Месяц

***Маладзік 5 кастрычніка. Месяц у сузор'і Шаляў.***

## Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Аляксея, Андрэя, Валянціна, Васіля, Данілы, Івана, Іосіфа, Ісака, Кандрата, Канстанціна, Уладзіміра.*

***К.** Разаліі, Ружы, Конрада, Францішка.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

**— Жонка-а-а, прыязджай, любошчамі на працоўным стале зоймемся!**
**— Дык у цябе ж там сакратарка!**
**— А што, можна?**

Пасля таго, як пажар ад вогнетушыцеля стаў яшчэ мацнейшым, Варвара Пятроўна зразумела, дзе дзеці хавалі ад яе алкаголь.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 23.419. Індэкс 63850. Зак. № 4317.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 кастрычніка 2013 года.